ZДAPЄNNI

Od Redaktora

W drugim dniu Trójcy Św. zakończył się festiwal „Tam po majowuj rosi". Nasze założenie, aby planując wydarzenia festiwalowe iść śladem cyklu świąteczno-liturgicznego, sprawdziło się. Bo wielka w tym jest harmonia, kiedy obrzęd wołoczebny jest na Welikdeń, obrzęd obchodzenia zasiewów żyta – w dniu św. Jerzego, ohulki-rohulki śpiewane są do Prowodów, uroczystość Usześcia (Wniebowstąpienia) świętujemy razem z parafianami cerkwi w Klenikach, a z „kustem" obchodzimy gospodarstwa w dniu Św. Trójcy. Wszystko odbywa się w swoim czasie i w naturalnych warunkach wiejskiej ulicy, ławeczki, sadu, łąki i pola. Wówczas aura sprzyja, a nie do końca zaplanowane sytuacje tworzą najlepszy scenariusz.

Taki improwizowany spektakl odbywał się w naszej białorusko-podlaskiej przestrzeni od 5 maja do 24 czerwca tego roku. Od Wojszek i Kaniuków na północy po Medweżyki i Rogacze na południu. Od Grabowca i Stryków na zachodzie, po Białowieżę na wschodzie.

Rozpoczęliśmy od obchodów żyta na Nowych Porubach w Studziwodach. W drugim dniu Paschy, w którym tez wspominaliśmy dzień św. Jerzego, przybyli do nas młodsi i starsi przyjaciele w Chmielewa. Z wołoczebnymi pieśniami i życzeniami odwiedziliśmy wówczas najstarszego mieszkańca Studziwód – 90-letniego Fiedię Ostaszewskiego. A potem pojechaliśmy za wołoczebnym do podbielskiego Grabowca. W tej mieszanej wsi na pograniczu etnicznym polsko-białoruskim przyjmował nas sołtys ... Misiuk i kilkunastu innych prawosławnych mieszkańców. Sąsiednie Stryki przyjęły nas bardzo gościnnie. Tłum ludzi podążał za wołoczebnikami, a gospodarze szeroko otwierali przed nimi bramy.

Trzeci dzień Welikodnia spędziliśmy w Malinnikach. Była modlitwa w miejscowej cerkwi św. Gabriela, świąteczny obiad w sadzie gospodarstwa Wiery i Mikołaja Niczyporuków, obchody żyta, rozśpiewany spacer po wiejskiej ulicy i potańcówka w świetlicy. Potem, praktycznie co tydzień wyjeżdżaliśmy na potańcówki w różnych miejscowościach. Graliśmy polki, oberki, podispana, łysego i inne tańce w Rejpiczach, Krywiatyczach i Zbuczu.

W wielkanocną sobotę, rozlewiskiem Narwi i zlotem ptactwa wodnego przywitały nas białoruskie Kaniuki. Ojciec Grzegorz Sosna serdecznie przywitał gości z poleskich Działłowicz w cerkiewce św. Cyryla i Metodego. Potem polesko-podlaskie pieśni niosły się nad Narwią, dolatując aż do Kożyna. Wszyscy słuchali też białoruskich opowieści Włodzimierza Naumiuka. Jeszcze w tym dniu modliliśmy się przed puchłowską ikoną Bogarodzicy, śpiewaliśmy w muzealnej zagrodzie Michała Filianowicza w Skaryszewie, przeszliśmy z korowodem przez Tyniewicze. Niedzielę zaś przewodnią świętowaliśmy razem z parafianami cerkwi w Rogaczach (więcej o tym w materiale „Wesna w Mikuliczach").

Podobnie, z parafianami cerkwi w Klenikach spędziliśmy Święto Usześcia (Woznie-sienija – Wniebowstąpienia). Wraz z gośćmi – Poleszukami ze Sporowa modliliśmy się w miejscowej cerkwi, przeszliśmy korowodem przez wieś, a potem przy świetlicy były pieśni i tańce. Jak na odpust przystało. A w następnych dniach tej części festiwalu nasi goście ze



Obchód żyta w Strykach w dniu św. Jerzego, 6 maja 2013 r.; od lewej: starosta cerkiewny Radosław Godun, ikonograf Grzegorz Zinkiewicz i sołtys Leon Syczewski, foto Maksima Fionika

Sporowa, Kobrynia i Mińska prezentowali się w Bielsku, Szczytach i Studziwodach.

W dniu Św. Trójcy najważniejszym wydarzeniem był korowód z obrzędem „kusta" w Wojszkach, który prowadziła mińska „Hamanina" i studziwodzka „Żemerwa". Gospodarze wychodzili przed swe piękne, ornamentowane domy, przyjmowali życzenia zbioru dobrego urodzaju, obdarowywali „kusta". A potem sołtys Jan Bruczko zaprosił wszystkich do śpiewania i tańców przy muzyce tradycyjnej kapeli spod Krynek. To już drugie, znaczące wydarzenie kulturalne w Wojszkach, z naszym udziałem. W styczniu, razem z „Hamaniną" kolędowaliśmy i koncertowaliśmy tu w czasie „Spotkań na Wodochryszcza".

W drugim dniu Św. Trójcy poprowadziliśmy „kusta" po Białowieży. Było kameralnie, ale bardzo uroczyście. Szczególnie na drugich Podolanach, gdzie niegdyś obrzęd „kusta" był żywy. W oczach ludzi widać było wzruszenie; ożywiliśmy tradycję, którą tworzyli niegdyś ich przodkowie.

Ożywianie tradycji w jej naturalnej sytuacji jest właśnie główną ideą spotkań „Tam po majowuj rosi" oraz „Oleń po boru chodit". O naszej dziesięcioletniej drodze w tej materii traktuje album „Pieśń, która nie umilkła", który niebawem ukaże się drukiem. W tym roku także zespół i studio folkloru „Żemerwa" obchodzi swe dziesięciolecie.

A teraz zapraszamy czytelników do odkrywania, na łamach naszego pisma kolejnych, mało znanych wątków naszej podlasko-poleskiej historii.

Doroteusz Fionik




Nestora Pierewoja opisanie wsi Knorozy

Niewiele wsi na Ziemi Bielskiej doczekało się do tego czasu tak wnikliwie i błyskotliwie napisanego opracowania kulturologicznego, jak „Złota Księga o wsi Knorozy”. Jej autor, Nestor Pierewoj, to jedna z najwybitniejszych postaci w dwudziestowiecznej historii podlaskich Białorusinów.

Pierwsza część „Księgi”, którą opublikowaliśmy w poprzednim numerze, dała nam ogólną wiedzę o topografii, historii, etnografii oraz stosunkach społecznych we wsi Knorozy. Druga część, podobnie jak pierwsza, została spisana własnoręcznie przez autora w ojczystym języku białoruskim. W brulionie formatu A5 zapisano 128 stron. W drugiej części, której podtytuł brzmi: „O wsi Knorozy powiatu bielskiego, a w szczególności o każdej rodzinie i jej gospodarstwie”, autor opisuje 94 knorozowskie gospodarstwa. Charakteryzuje on poszczególne osoby, podaje ciekawostki z ich życia. Pamięć autora sięga końca XIX wieku, a więc jest to świadectwo bezcenne. Niektóre z opisanych gospodarstw przestały istnieć po bieżeństwie, inne po II wojnie światowej. Przy poszczególnych nazwiskach gospodarzy autor podaje oryginalne przezwiska. Wymieńmy je: Szabelba, Fajs, Bałakson, Hopczuk, Fejbel, Denisiuczok, Szundar, Mendel, Swerenka, Bahlij, Babaj, Mondzik, Tera, Smuż, Selewulich, Derkacz, Żur, Psztyk, Sycz. Wiele z nich funkcjonuje do dziś.

W opracowaniu znajdziemy opis knorozowskiej karczmy, istniejącej przed I wojną światową. Jej właścicielem był Żyd Nosko, który miał żonę Chanię, syna Berka oraz córki Sarę i Rejzę. Nestor pisze, że budynek był bardzo stary (czyli zbudowany na początku XIX wieku) oraz obszerny. Składał się z wielkiej izby o ceglanej podłodze oraz wielu pokoi i pokoików. Karczma była miejscem spotkań towarzyskich; tu odbywały się tańce, do których przygrywał skrzypek Ihnat Jaroszuk. W karczmie gospodarze często tracili pieniądze, co, oczywiście, nie podobało się ich małżonkom. Kobiety zaczęły z czasem bojkotować karczemny sklep Noski, wpływając na przeniesienie budynku z ogrodu Oksentego Korniluka na kraniec wsi od strony Zubowa.

Oprócz rodziny Noski, w Knorozach była inna rodzina żydowska – kowala Mejera i jego żony Małki. Wiemy, że swą córkę Chaję wydali za mąż do Bielska.


1

Залатая кніга

Частка 2

Аб вёсцы Кнаразы Бельскага пав.
а ў асобеннасці аб кожнай сямьі і
яе гаспадарцы
Напісаў Нестар Нестаравіч Пераво́й.

Сабраўшыся ў групу калежанак
ці калегаў па школьнай лаўцы, якім
цяпер ужо каля 80 год, з вялікай
прыемнасцю ўспамінаецца ўсё пераж
тае ў разгаворы на тэмы штодзённаг
жыцця. Успамінаецца, як разам за
баўляліся летам у цёплым сухім пя-
сочку на ўзгорку. Як зімою спускал
ся з горкі на самадзельных санчках
ці на самадзельных дзеравяных лыжва
або круцёлцы на лёдзе. Як пасля

Tytułowa strona drugiej części „Załatoj knihi”



Brat Nestora – Fieodosij Pierewoj z żoną Marią, okolice Wołkowyska, 1948 r.

W pierwszej części opracowania Nestor Pierewoj pisał o stworzonym na początku XX wieku przez nauczyciela Aleksandra Ruszkowskiego chórze młodzieżowym, z którego Knorozy słynęły w okolicy. Wieś była muzykalna i rośpiewana. Innym animatorem życia muzycznego we wsi był Sachar Fiedoruk. Koło swego domu zbierał młodzież i osoby starsze, które tworzyły chór. Jego pieśni można było słyszeć nawet w sąsiednim Zubowie. Nestor nazywa Sachara „wybitnym dyrygentem i kompozytorem". Oprócz niego zdolnościami muzycznymi wyróżniał się skrzypek Ulian Daniluk.

Do dziś w Knorozach żywa jest opowieść o zesłaniu na Syberię kilku mieszkańców wsi. Nestor Pierewoj doskonale pamiętał wydarzenie, które do tego doprowadziło. W 1895 r. grupa mężczyzn ciężko pobiła Sylwestra Wawreniuka. Sąd skazał ich na zesłanie na Syberię, jednakże bez rodzin. Nestor uważał, że w warunkach przeludnionych wsi i głodu ziemi przed I wojną takie postępowanie nie przyniosło dla państwa zamierzonych efektów. Należało bowiem przymusowo przesiedlać całe rodziny, a nie tylko mężów-winowajców. Ich żony z dziećmi przez lata zesłania cierpiały w Knorozach biedę. Z drugiej strony, mężczyźni, którzy w 1904 r. powrócili z zesłania, przynieśli do Knorozów nowinki agrotechniczne i stali się prekursorami postępu rolniczego. Jako pierwsi zamienili drewniane sochy na żelazne pługi. Wymienili drewniane osie w wozach na żelazne oraz pierwsi zaczęli używać nawozów sztucznych.

Nestor Pierewoj podaje wiele ciekawych informacji o innych ludziach ze wsi Knorozy. Wspomina o gospodarzu, który w czasie wojny rosyjsko-tureckiej z lat 1877-1878 uczestniczył w zdobyciu twierdzy Bajazet. Z kolei Ihnat Kononiuk był w końcu XIX wieku mnichem w Kijowo-Pieczerskiej Ławrze. Do tejże Ławry udała się wówczas w pielgrzymkę Kilina Markowska, żona Andrzeja. Przez wiele lat nie mogła mieć dzieci. Ofiarowała się w pielgrzymkę do Kijowa. Po pewnym czasie urodziła córkę Anastazję.

Nestor pisze o Wawrenie Stepaniuku, który w czasach jego młodości, a więc w końcu XIX wieku, był bardzo starym człowiekiem. Można przypuszczać, że urodził się ok. 1810 r.

Nestor Pierewoj wspomina mieszkańców wsi, którzy nie powrócili z bieżeństwa: rodzinę Pawła, Daniła i Nestora Andrejuków, Adama Puczko z żoną, Chilimona i Chwedora Kiryluków, Timofieja Kononiuka, jego brata Janeczka i syna Nestora, rodzinę Adama Jakoniuka.

Ukazana w opisie społeczność knorozowska jest ambitna. Wiele osób starannie prowadziło swe gospodarstwa, które dawały


Кнаразы ў 1965 г., вуліцай ідзе Марына Клімюк, за ёю на кані едзе Дмітёр Клімюк

zyski i pozwalały gospodarzom inwestować m.in. w kształcenie dzieci. Już przed I wojną światową niektóre z nich kontynuowały naukę w szkołach średnich. Łukasz Tomaszuk ukończył Seminarium Nauczycielskie w Swisłoczy. Był potem nauczycielem i postępowym rolnikiem.

Swych ziomków Nestor Pierewoj opisuje z sympatią i miłością. Jak dobry ojciec, nie idealizuje ich jednakże, pokazując zalety, ale i wady. Bo różnie i dziś się układa w stosunkach rodzinnych i sąsiedzkich. Knorozy nie były w tym względzie wyjątkowe. Poprzez to obraz knorozowskiej społeczności jest żywy, a przesłanie płynące z jej opisania – pouczające.

Doroteusz Fionik

Redakcja dziękuje panu Jerzemu Bajenie, prezesowi Oddziału Związku Nauczycielstwa Polskiego w Bielsku Podlaskim za przekazanie rękopisów Nestora Pierewoja.

Za udzielenie oraz pomoc w poszukiwaniu archiwalnych fotografii dziękujemy panu Mikołajowi Nikołajukowi, Janowi Kirylukowi, Andrzejowi Kryszpiniukowi oraz innym mieszkańcom wsi Knorozy.



Сабраўшыся ў групу калежанак ці калегаў па школьнай лаўцы, якім цяпер ужо каля 80 гадоў, з вялікай прыемнасцю ўспамінаецца ўсё перажытае ў размовы на тэмы штадзённага жыцця. Успамінаецца, як разам забаўляліся летам у цёплым сухім пясочку на ўзгорку. Як зімою спускаліся з горкі на самадзельных саначках, ці на самаробных драўляных лыжвах або круцёлцы на лёдзе. Як пасля паслі каровы ці гусі. Як купаліся на плыткім месцы ў рацэ Арлянцы, ці хадзілі па грыбы на Беляноўшчыну ці Пэхава. Або як адзін хлапец яшчэ ў дзяцінстве меў прыязныя адносіны да той ці іншай дзяўчыны, а нават часта ўспамінаецца як хадзілі разам красці яблыкі з саду абшарніка Гэндзля. Аб усім гэтым прыемна пагаварыць, але толькі пакольkі сягае нашая памяць.

Але калі падумаеш як то было раней да нас, як жылі нашыя бацькі, дзяды ці прадзеды, якое іх было жыццё, якое тады было права, якая культура, якія былі разрыўкі ўмысловыя ці фізічныя, то тут цяжка было ўявіць, бо запісы можна было знайсці толькі ў кніжках. Але ніякіх кніжак у сяле не было, а тым больш не было бібліятэкі, радыё, тэлевізара ці кіоскаў “Руху”.

Ніхто ніколі апроч ураднікa не прыязджаў да вёскі. Таксама ніхто нікуды не выязджаў з вёскі далей павятовага горада Бельска ці да царквы да вёскі Пасынкі. Тутака мімаволі паўстае пытанне, ці добра было б, каб хто нібудзь апісаў жыццё сялян хаця б за сто ці дзьвесце гадоў да цяперашняга часу, з як найдакладнейшым пералічэннем усіх накірункаў сельскагаспадарчага, эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця нашых продкаў. Безумоўна гэта было б вельмі цікава ведаць і на гэтай аснове я пастанавіў апісаць па магчымасці падрабязна аб жыцці кожнай сям’і. Але перад тым трэба задаць пытанне, ці нашыя дзяды ці прадзеды зусім нічога не рабілі, не цікавіліся, як палепшыць сваё жыццё, а тым самым і нашае, бо калі хто дасягне якое ўлепшэнне, то яно як бы аўтаматычна пераходзіць на карысць наступных па нас пакаленняў.

З кніжак можна даведацца, што быў час, калі людзі не ведалі як здабываць агонь. А калі не было агню, то трэба было есці напрыклад мяса сырое. Без агню не маглі абаграваць і сваіх памяшканняў. Тады, калі не было агню, то не было і жалеза. Не было нажа, пілы, сякеры. Калі спалявалі якога дзікага звера на мяса без стрэльбы ці пораху, то мусілі яго парваць зубамі і з’есці сырога, а вядома што варанае ці жаранае мяса смачнейшае і страўнейшае ў харчаванні людзей. Таксама прыемней зімою пагрэцца на цёплай печы, чым мёрзнуць на холадзе, а тым больш без кажуха ці валенак, якіх раней не было. Калі не было агню, то не было і ніякай пасудзіны. Не было бляшаных вёдраў, чыгуноў, скавародак, ці кубкаў. Трэба было насіць ваду ў скураных торбах. Не было тады і нажніц для стрыжкі ці грэбеняў да чэсання валос, або брытвы для галення барады. Гэта ўсё адкрыта ўжо даўно, а значыць гэта заслуга нашых даўнейшых продкаў.

Немалаважнае значэнне мае факт асваення дзікай звярыны як кароў, каней, свіней ці авец. Дасягненні ў палепшанні жыцця былі, як былі і імкненні да но-



вых адкрыццяў, але ўсе новыя рэчы ўводзіліся ў жыццё не адразу, а вольнымі тэмпамі. Хочацца сказаць, што і за нашай памяці не заўсёды новыя рэчы хутка распаўсюджваюцца. Адно трэба зазначыць, што ў жыцці людзей калісь і цяпер можна было назіраць некаторыя склоннасці да дзялення на групы паводле ўзросту. Напрыклад дзеці любяць забаўляцца толькі з дзяцьмі. Моладзь таксама творыць асобную групу, а бабулькі ці дзядулі вельмі ахвотна балагураць між сабою, ўспамінаючы ці то лепшыя, ці горшыя этапы пражытага. Аднак заўсёды крытычна адносяцца да выбрыкаў моладзі, як бы забываючы, што і самі калісь былі не лепшымі. Адсюль паўстала пагаворка, што "забыла карова як была цялём".

Памятаю, што ў першых так званых перадвіжных школах не было навукі танцаў, гімнастыкі ці спорту або спеву. Але добра памятаю, як на зялёнай траве на ўзгорку дзяўчаты вучылі хлопцаў танцаваць польку ці вальца, а пасля ўжо танцавалі пад музыку на скрыпцы на вяселлі ці проста на патанцоўках у святочныя дні. Памятаю, як хлопцы дужаліся на манер цяперашаніх боксаў і заўсёды быў на першым месцы Тодараў Пятро або Томашоў Мікалай. Памятаю таксама, як самачынна бегалі на выперадкі ці ўзапускі. Заўсёды найхутчэй і найспраўней бегала Журава Уляна, што замужам за Крывяніцай у Піліпках. Перашкаджала ёй толькі доўгая юбка, бо тады не было ў модзе насіць такія касцюмы як цяпер. Старэйшыя казалі, што ўстыд і грэх блыскаць голымі лыдкамі. Не мала спорту прараблялася ў плаванні на вадзе ў рэчцы Арлянка. Хто найхутчэй ці найлепш плываў. Хто ўмеў плываць на плечах. Хто найдаўжэй мог нуркаваць і лавіць рукамі ліноў, акуней ці іншую рыбу. У гэтым заўсёды быў на першым месцы Пархвенаў Лукаш. Памятаю набіраў ён у сябе як найбольш паветра, а апусціўшыся на дно ў ваду пакрысе выпускаў яго з сябе і калі ўжо праходзіў нейкі час, ён выплываў на паверхню вады і ў кожнай руцэ трымаў па адной вялікай рыбе.

Былі яшчэ практыкаванні, хто без слупалазаў найспрытней далезе да вароняга гнязда на, каля 30 метраў высокай, без ніжніх галінак, сасне і здыме гняздо. Забаўка гэта не зусім добра выхоўвала моладзь, але штуршком да знічтажэння гнёздаў вароны быў той факт, што варона крала маленькіх куранят і карміла імі сваіх дзяцей. Вельмі хвалілі гаспадыні за спрыт і адвагу таго хлапца, які прыносіў дахаты малых варанят.

Пераважна летам, на ўзгорку каля сяла, была яшчэ забаўка ў "вайну". Тут хлопцы і дзяўчаты дзяліліся на дзве, па магчымасці роўныя групы. Без ніякага ўзбраення, без боек, адна група павінна была параспіхаць "праціўніка" і перайсці праз фронт. Не заўсёды гэта ўдавалася, а найчасцей тварылася адна вялікая куча хлопцаў і дзяўчат, якія са смехам і высілкам вызваляліся з гэтага, як называлі "плена". Шмат і іншых было забавак у маладым узросце. Усіх іх цяжка памятаць. Можа хто чытаючы гэтыя словы набярэцца ахвоты апісаць іх і такім спосабам гэтая кніжка была б толькі як бы пачаткам летапісі аб вёсцы Кнаразы.

Заканчваючы гэтую ўступную размову, хачу толькі сказаць, што з кім бы я не пагаварыў, то ўсе найстарэйшыя людзі заўсёды казалі, што хаця пражыве дзевяноста ці цэлых сто гадоў, то пад канец жыцця не здаецца яму, што так шмат гадоў пражыў, а здаецца, што як бы толькі нядаўна нарадзіўся. Забываюцца пераважна вясёлыя перажыванні і, наадварот, часцей і лепш запамятваюцца цяжкія перажыванні, як вайна і яе вынікі,

смерць каго з блізкіх, цяжкія хваробы, гады неўраджаю і галадоўкі і г.д.

Калісь людзі не ўмелі пісаць і таму цяжка ім думаць аб якіх бы то ні было запісях. Але цяпер трэба, каб кожная вёска мела сваю кнігу, да якой бы запісваліся хаця б найважнейшыя здарэнні на працягу цэлых вякоў.

Апісваю кароткую характарыстыку кожнай сям'і. Пачынаю ад шырокай дарогі, якая была выганам для жывёлы на пасбішчы ўбок Свічкова і дарогі да царквы ў вёсцы Плёскі.

Стэпуль Самчук

Быў ён участковым гаспадаром, а гэты ўчастак складаўся з 18ці дзесяцін разам: ворнага, сенакосаў, пастбішчаў, лесу і розных неўгоддзяў. Працаваў тут сам Сцяпан і яго жонка Еўка. Тады не было ніякіх машын. Не было керата, сечкарні ці малацілкі. Сечку трэба было рэзаць у так званай лядзе, а асыпку і муку на хлеб малолі ў ручных жорнах. Слабасільная, хваравітая і далікатная Еўка не вытрымала навалу непамерна цяжкай працы і хутка памерла. Аставіла яна двух сыноў: Язэпа і Барыса. Барыс калі падрос то выехаў да Амерыкі, а Язэп хутка памёр. Другою жонкаю Сцяпана была прыгожая высокага ўзросту, здаровая жанчына з вёскі Шасталы. Мела яна вялікія здольнасці да фізічнай, цяжкай працы ў гаспадарцы. Сцяпан жа быў ужо тады чалавекам пісьменным. Заўсёды паслугоўваўся кніжкай па сельскай гаспадарцы. Усе добра ведалі аб гэтым, але Сцяпан трымаў здабытыя веды ў таямніцы. Нікому ніякіх парад са сваёй практыкі не ўдзяляў, а нават цяжка было выпрасіць у яго гэтыя кнігі, каб толькі пабачыць іх. Ніякай школы тады не было ў Кнаразах і ніхто не ведае ад каго Сцяпан навучыўся чытаць і пісаць. Але адно можна сказаць, што Сцяпан быў чалавекам паступовым.

Ад другой жонкі, якую здаецца звалі Аксіняй было тры дачкі. Да найстарэйшай прынялі зяця Тымахвея Максімюка з вёскі Катлы. Другая вышла замуж за Сцяпана Хаманюка, якога хутка забіў матаровы сьрутоўнік у Дамброўскага на Беляноўшчыне. Трэцяя дачка выйшла замуж за Дмітрука ў вёсцы Кнаразы. Жонка Тымахвея была бяздзетная, таму ўзялі да сябе дачку Дмітрука Міхася і гаспадарка гэта перайшла як бы ў трэція рукі. Важна дадаць, што Шасталоўка, як заўсёды называлі другую жонку Сцяпана ўмела зганяць або замаўляць рожу, затрымаць крыватокі і г.д. Карысталася яна вялікай пашанай у жанчын вёскі Кнаразы, а нават аколіцы. Каля хаты Сцяпана Самчука расла вельмі старая груша-дзічка, якіх было шмат на полі. Цяпер там гаспадарыць Кастусь Бедрыцкі з вёскі Чыжы гайнаўскага павету.

Сімон Андрэюк

У яго было два сыны Іван і Супрун. Яшчэ пры бацьку сыны падзялілі па роўну цэлую гаспадарку. Бацька з Супрунам засталіся ў старой хаце, а Іван – Янком звалі, паставіў сабе новую. У Янка была вялікая сям'я. Як памятаю падслепаваты і падглухаваты Сцяпан, вельмі прыгожы Хвэдар, які забіты на вайне, Рыгур, які і цяпер яшчэ жыве (быў членам Беларускай сялянска-работніцкай Грамады) ды Яўдося, якая выйшла замуж да Аўгустова і таксама яшчэ жыве. Ганна памерла падчас бежанства. Быў тут яшчэ Антон Андрэюк, які разам з Шрэйдарам выехаў да Амерыкі, а хутка за ім паехала яго нарачоная Пелагея Капітанюк-Гарэцкая. Ніякіх звестак аб іх няма. Цяжкае было жыццё Янкі. Шмат грошай і працы пайшло на



Акуліна Гродзінска з братам Дзмітрам, родам з Дэніскаў; Пасля вяртання з Расіі, дзе з братам працавала ў Царскім Сяле, выйшла замуж за Омэляна Кірылюка з Кнаразоў



Кнаразоўцы ў расійскай арміі, перад 1915 г.



Фёдар Ваўрэнюк, Ольга Сідорук з сынам Алексіем, Уладзімір Семенюк, 1945 г.



Фёдар Стэпанюк, фота Зэлік Вільк, 1930-ыя гады

адбудову. Вялікая сям'я малалетніх дзяцей патрабавала высілкаў збоку бацькоў. Трэба сказаць праўду, што часта тут не хватала чорнага хлеба на харчаванне цэлай сям'і. Да гэтага ўсяго далучылася новае гора. Бацька ў чацвер купіў свежага, яшчэ цёплага хлеба, а што быў вельмі галодны, раптоўна з'еў яго больш ці менш, захварэў на заварот кішак і адразу памёр, бо тады яшчэ не было *Пагатоў'я Ратунковага*. Адсюль то стала праўдзівая бяда і гора з маленькімі дзяцьмі. Але Янка ніколі і ні з кім не сварыўся, кожнаму як толькі мог дапамагаў і калі сам памёр, то і дзед Сімон і цэлая радня і суседзі ўсемерна дапамагалі ў выхаванні дзяцей.

У Супруна было два сыны. Адзін і цяпер нежанаты. Жывуць яны ў добрай згодзе суседзямі. Дачка Маруся выйшла замуж за Сямёна Данілюка. Жонка Супруна забіта снарадам у бункры на прагуменні падчас другой вайны з немцамі.

Дзямян Нікітюк

Жыў на ўсход ад Сімана, а празывалі яго Мэндэль. Хаця і яго сям'я складалася з трох сыноў і пяці дачок, але на цэлым участку зямлі ён мог развярнуцца цэлай сваёй ініцыятывай. Быў ён паважаны не за сваю дабрату, а за тое, што ён лічыўся адным з найбагацейшых гаспадароў. Нібы дапамагаў кожнаму, але пры гэтай аказыі і выкарыстоўваў яго. Дочкі яго былі вельмі прыгожыя. Мэндэль у Кнаразах не знаходзіў ніводнага хлапца годнага яго дачкі і аддаваў за найлепшых гаспадароў з іншых вёсак. І так Прузыну ён аддаў замуж да Пасынак за Немчуковага Дзяніса прозвішчам Маркевіч. Другую да Крывой за Авэрка, трэцюю да Зубава за Сімана Вязоўскага па прозвішчу Цэкала, чацвёртую да Кожына за Ваўрэнюка, а наймалодшую Барбару застала першая сусветная вайна і лёс закінуў яе да Смаленска. Можа і цяпер там жыве? Мэндэль дакупіў ад Сяргея Савіцкага получастак зямлі і ўсадэбны агарод. Падзяліў гаспадарку паміж сваіх сыноў Міхаля і Івана і тады памёр. Сыны яго не дажылі да глыбокай старасці і хутка паўміралі. Наймалодшы Трафім быў жанаты на Пелагеі Паўлаўне – столяручцэ Міхалюк з Агароднік. Ужо пасля рэвалюцыі ў Маскве быў следчым камісарам, закапаўся ў даручаных яму справах і выстралам з рэвальвера закончыў сваё жыццё. Заставіў жонку і дачку, якая і цяпер працуе як лекар медыцыны ў Маскве. Я быў на яго пахаванні.

Жонка Івана жыве ў дачкі Марысі ў Бельску, а ў Кнаразах у іх доме склеп спажыўчы Г.С. Калісь перад ўваходам да сені старой хаты расла вялікая, старая дзічка груша. Дзюплястым бокам яна стаяла да дзвярэй і часта была засіляна паліўкамі.

Кандрат Дмітрук

Яго празывалі Смаркатым. Тут быў той аднагоднік Кандрат, які цяпер баптыст і яго сястра Марына, якая выйшла замуж да вёскі Койлы. Вучыліся мы разам у школе. Я часта там бываў, каб супольна падрыхтоўваць урокі. Жыла гэтая сям'я не багата, але мне здаецца, што мяне нідзе не прымалі так міла і сардэчна, як ў гэтым доме, хоць дом быў вельмі старэнькі. Цяпер на гэтым месцы пастаўлены два дамы, ў якіх жывуць сыны Кандрата са сваімі сем'ямі. Адзін хлапец тут прыгожа грае на гармоніі і ёсць забаўным кавалерам.

Аўсеній Стэпанюк

Сын яго Лук'ян быў высокага росту. Вясёлы, заўсёды спяваў на вуліцы надзвычай грубым голасам – басам, аж да актавы. Жонка яго была Тэкля ад Зайцаў. Патомкаў не было. Пасля смерці Лук'яна Тэкля выйшла паўторна замуж за Нічыпара –



Трачка дрэва; Іван Сідорук і Андрэй Крышпінюк, к. 1965 г.



Дзеці з настаўніцай Валянцінай Асмольскай каля школы ў Кнаразах, 1954 г.



Сям'я Стэпанюкоў, 1970 г.



старога, якога прazывалі Бабаям. У Лук'яна быў брат Трафім. Яго жонка была Таццяна з вёскі Кленікі. Вельмі была разумная і працавітая жанчына. Дачку Марысю аддала за Аляксандра Сідарука. Пасля смерці бацькі сын Хвэдар доўгі час вёў гаспадарку разам з маткай. Калі памерла маці, то ён сам працуе на цэлай участковай гаспадарцы. Стары гэта кавалер. Калі хто яму ўспамяне аб ажэнку, то ён нават гневаецца. Сам сабе варыць есці, мые бялізну, гадуе шмат кароў, свіней і каней, а да працы на полі толькі ў крайнасці наймае на помач жанчын.

Сельвестар Ваўранюк

Жыў на поўучастку. Нічым асаблівым ён не адрозніваўся ад іншых гаспадароў. Хатку меў вельмі маленькую і не праяўляў ніякай ініцыятывы. Сын яго Хілімон, якога Мондзікам прazывалі, меў вялікія гандлёвыя здольнасці. Ездзіў ён нават па чужых вёсках, скупляў куры, гусі, качкі, а нават старыя шматы і гэтым самым дарабляў да ненайлепшай гаспадаркі. Сын жа Хілімона – Іван Ваўранюк і яго жонка Паўліна з Зубава вядуць гаспадарку больш інтэнсыўна. Маюць яны ўсе прыгожыя будоўлі. Іван самавукам добра вырабляў з карэння і лазы прыгожыя падстаўкі пад кветкі, практычныя калыскі для дзяцей, сталы, крэслы і іншыя рэчы. Прадаваў усё гэта на рынку і гэтым самым адбываў усе грашовыя патрэбы. Зрабіў сабе прыгожыя вароты з друцяной сеткі, а калі быў старшынёй Спулдзельні прадукцыйнай, то ўсіх здзіўляў сваёй працай і арганізацыйнымі здольнасцямі.

Сідар Красоўскі

Жыў таксама на поўучастку. Нічым асаблівым не адрозніваўся ад іншых. Жонка яго была калісь вельмі прыгожая дзяўчына. Старэйшы сын Сідара – Аляксандр, жанаты на дочцы Дзмітра з Зубава, жыве ў Бельску і працуе на Пошце. Малодшы працуе ў меліярацыі, а дачка Валя ў Грамадскай радзе нарадовай у Храбалах. Сідар мае прыгожы дом. Каля дома сучасны сад і тут жа ў яго хаце Грамадская бібліятэка. Сідар доўга хварэў на рака і памёр страшна пахудзеўшы.

Прокопэць Іванюк

Жыў далей на ўсход ад дома Сідара Красоўскага. У Пракапця было два сыны Прохвілій і Нічыпор. Яны ўжо паўміралі. Старэнькая іх хатка і цяпер яшчэ стаіць і маленькімі акенцамі глядзіць на вуліцу. Жывуць тут цяпер ужо не людзі, а авечкі, бо цяперашні ўласнік гэтай гаспадаркі Янка Кавальчук пабудаваў сабе новую прыгожую хату. Жонка Янкі каталічка, але вельмі дзельная гаспадыня. Сам гаспадар быў солтысам, выконвае функцыю Пшодоўніка Охроны Рослін. Адзін з найлепшых прагрэсіўных гаспадароў. Гэтая старэнькая хатка ёсць сведкам старадаўняй архітэктуры і будоўлі. Вельмі непрыгожа выглядае маленькі, напалавіну развалены хлеўчык, які прэзэнтуецца фронтам да вуліцы.

Антоній Іванюк

Доўгі час ён быў у палоне ў немцаў і ў Савецкім Саюзе. Пасля дзесятка гадоў вярнуўся ў Кнаразы. Яго ўласныя дзеці не пазналі. Жонка яго гэта дачка Максіма. Антоні Іванюк добры сталяр, цясляр і пячнік. Немала курыць папіросаў і п'е гарэлкі. Гаспадарка яго менш цікавіць. Цяпер ужо памёр.

Уладзімір Ваўранюк, сын Мікалая

Яго таксама, як бацьку прazываюць Бабай. Жонка яго з Кленік, слабога здароў'я, а сам Уладзімір амаль зусім глухі.



Харытіна і Омэлян Іванюкі з дзяцьмі: Коляй, Веркай і Гандзяй, 1943 г.



Кнаразоўскія хлопцы на одпусце, злева Фёдар Стэпанюк, 1930-ыя гады



Кнаразоўская кавалерка, 1950-ыя гады

Шмат часу трэба было б папрацаваць над ім, каб давесці хаця б да сярэдняга агульна-людскога выхавання.

Дэмід Ваўранюк

Быў сынам Корніла. Вельмі не зарадны гаспадар. Цэлае жыццё ў яго была на першым плане ігра ў карты, п'янства, курэнне папіросаў і г.д. Тут падбіралася адпаведная група людзей. Пагаворвалі людзі, што не абходзілася без пакражаў. Жонка яго была з вёскі Грабавец. У размове яна часта ўжывала слова "тэра" і таму яе ўсе празывалі Тэра. Была яна вельмі не зарадная. Гаспадарка ішла вельмі дрэнна. Дэмід Ваўранюк прадаў у Кнаразах сваю зямлю, хатку перанёс да Бельска на куплены на вуліцы Пасвентай пляц і тут жыў толькі некаторы час, але хутка памёр. Жонка яго Тэра і цяпер тут жыве з сынам і внучатамі ў новай прыгожай хаце. Сын яго не ўдаўся да бацькі.

Андрэй Ваўранюк

Быў братам Дэміда, пабудаваны на тым месцы, дзе калісь жыў брат. Цяпер тут жыве з сям'ёю яго сын Мікалай і Грыгор.

Ад хаткі Дэміда Ваўранюка і да старой хаты Лукашыка Паўлючука была вялікая прагаліна. Старыя людзі казалі, што не будаваліся тут таму, што па другой старане вуліцы стаяў толькі збажовы магазын, далей капалі гліну на падлогу да хатаў, на клепіска да клуняў, з гліны білі таўкачамі хлябовыя рускія печы, будавалі камінкі, на якіх палілі лучыну і асвятлялі хаты і гліняныя копкі на прыпечку, куды выгортвалі жар, калі пяклі ў пячы хлеб, пірагі, каравай, пячонкі мяса пад вяселле або хрысціны, ці як сушылі лён ці каноплі на валакно. Па выкапках гліны аставаліся глыбокія ямы, часам напоўняны вадою. Усё гэта стварала непрыгожы выгляд. Усе ў адзін голас цвердзілі, што тутака па начам штосці страшыла і таму доўга не было аматараў тут будавацца. Цяпер у гэтым месцы школа і прыгожы сад і найпрыгажэйшыя хаты і зусім няма ніякіх страхаў.

Сцяпан Данілюк, сын Сахарка

Бацька Сцяпана меў некалькі буйнейшы характар. Любіў выпіць. За пабіцце Сэльвестра быў чатыры гады на вольным пасяленні ў Сібіры. У бойцы гэтай быў Сахарко не адзін. Бралі ўдзел яго тэсць Кузьма і швагар Ігнат-Шабельбамі празывалі і Сяргей Савіцкі, а разам чатыры чалавека. Усе яны былі засуджаны на вольнае пасяленне на заўсёды. Праз чатыры гады яны пабудавалі сабе новыя хаты ў Сібіры. Завяліся цэлай гаспадаркай на раллі. Калі нарадзіўся ў царыцы Аляксандры сын Аляксей, як наследнік расійскага прэстола, цар Мікалай II выдаў дэкрэт аб амністыі. Усе чацвёра прыехалі зноў да сваіх жон і дзяцей, але не з тым, каб тут дажываць да смерці, а з тым, каб з жонкамі і дзяцьмі зноў паехаць у Сібір. Бо яны пераканаліся, што ў Сібіры можна мець лепшыя ўмовы жыцця. Жонкі не захацелі ехаць. Пакараныя цвердзілі, што не там Сібір, а сапраўдны Сібір, значыць катарга – у Кнаразах, але самі не паехалі паўторна туды, так і засталіся.

Трэба сказаць, што жонка Сцяпана Данілюка Раіна была дачкою Сэмэна Гагана з вёскі Піліпкі. Падкрэсліваю гэта таму, што калісь як я закончыў школу ў Кнаразах, то яшчэ вучыўся ў школе ў Пасынках. Тут вучыўся Гаган, а на адно й лаўцы са мною сядзела Немкава Марыся, прозвішчам Маркевіч. Яна даўжэйшы час вучылася ў Пасынках. Была шмат мацнейшая ад мяне ў навучы. Дапамагала мне. У нас былі вельмі прыязныя адносіны, якія засталіся на ўсё жыццё. Выйшла яна замуж да вёскі Піліпкі за таго ж Гагана. Нядаўна памерла. Канец яе жыцця быў не найлеп-



Кнаразоўцы каля царквы ў Плёсках: Пётр Сідорук, Павел Федорук, Мітя Скепко, к. 1965 г.



Жанчыны з Кнаразоў: Зінаіда Андрэюк, Марыя Корнілюк, Марыя Стэпанюк, Зінаіда Паўлючук, Люба Ваўрэнюк, к. 1965 г.



Іван і Васіль Федорукі на одпусце у Плёсках, к. 1955 г.



Кнаразоўскія мужчыны, к. 1960 г.

шы. Раіна была яе дачкою.

Гаспадарка Сцяпана пастаўлена добра. Мае добрую хату і ўсе гаспадарчыя будоўлі. Каля хаты Сцяпана Данілюка доўга стаяла старэнькая хата Лукашыка Паўлючука і яго сына Барыса. Нічым асаблівым яна не адрознівалася ад іншых тагачасных. Для мяне яна добра памятаецца тым, што тут жыла жонка Лукашыка, якая была маёй хроснай мамкай. Быў тады такі звычай. На кожны Вялікдзень я прыходзіў сюды па так зване “волочобнэ” Мамка заўсёды давала мне не толькі волочобнэ, гэта значыць пару ахварбованных у цыбульніку яек, але яшчэ затыкала мне за пазуху добрую лусту пірага з родзынкамі, кусок каўбасы і адну мутэрку цукру. Каля хаты Лукашыка расла вялікая груша, з якой я не раз збіраў спады. Мне здавалася, што ў Кназарах не было лепшых людзей ад гэтай сям’і. Цяпер тут гаспадарыць Мікалай Паўлючук. Гаспадарка пастаўлена добра. Стаіць тут новы прыгожы дом.

Даніла Артэмюк

Празывалі яго Памошкам. У яго быў брат Стэпаноцко, які амаль усё жыццё летам пас быдла ў суседняй каталіцкай вёсцы Грыневічы Малэ – Шляхтай звалі. Зімою Стэпаноцка цэпам малаціў збожжа і дапамагаў брату ў гаспадарцы. Была тут яшчэ сястра Данілы – старая панна. Сям’я хоць была вялікая, але дружная і працавітая. Найстарэйшы сын Іван быў жанаты з Елізаветай Хіліманюк. Забіты ён у першую вайну, а Елізавета выйшла замуж за Дэніса Томашука, і той нядаўна памёр і цяпер жыве адна. Другі сын Данілы Давыд выехаў у Савецкі Саюз і там цяпер жыве як інспэктар народных вучылішч. Трэці сын Васіль пайшоў у прыступы да Харытынінай дачкі ў Кназарах. Мікалай выехаў пасля другой вайны і цяпер жыве з сям’ёй у Стоўбцах, а Сафрон і цяпер жыве каля школы і бярэ актыўны ўдзел у працы грамадскай.

Антон Капітанюк-Гарэцкі

Жыў калісь па суседству з Данілам Артэмюком. Празывалі Антона – Смалюхом. Гэта значыць, што нібы калісь кагосці падпаліў. Але за маёй памяці раней ў Кназазах ніколі і ні ў каго не было пажару. Сын яго Янка вельмі дружыў з маім бацькам. Кумалісь, гасцілі адзін у другога і вялі нейкае сваяцтва. Разам вазілі з Белавежы дрэва на новыя хаты. Разам будаваліся і дапамагалі адзін другому. У Янка быў брат Супрун, які цэлае жыццё жыў недзе ў горадзе. Янко любіў порахам разбіваць вялікае каменне на падмуроўкі пад будоўлі. А вялікага камення па ўсім полі было многа. Адзін раз зарад пораху доўга не паліў. Янко быў ўпэўняны, што фітыль пагас. Падыйшоў да зарада і нахіліўся пагляздзець, якая прычына невыпалу. У гэты момант паўстаў узрыў і вельмі патурбаваў яму ўсё цела, падарваў здароў’е, а нават меў псыхічнае разстройства. Апрача таго яго жонка Даміся была разбіта паралічам і некалькі гадоў аж да самай смерці летам сядзела на сонцы на дварэ, а зімою ляжала на пячы. Дочкі Уляна і Палашка былі малыя і гаспадарка хутка мізэрнела.

У тым часе, пасля доўгай разлукі прыехаў да Кназазоў другі брат Івана – Віцэнты Капітанюк-Гарэцкі. Прывёз ён з сабою панкаватую жонку, дзве дарослыя дачкі і два сыны. Але Віцэнты быў дрэнным братам. З сынамі ён быў мацнейшы ад паўхворага Янкі. Хутка ён заўладаў цэлай гаспадаркай і Янка мусіў шукаць месца ў чужых. Але цэлая сям’я Віцэнтыя не вельмі парывалася да цяжкай працы на раллі. Гаспадарка не развівалася. Хутка ён прадаў цэлую гаспадарку і выехаў да Роўна. Адтуль старшы сын выехаў да



Кнаразоўская сям'я, справа Іван Паўлючук. 1943 г.



Іван Паўлючук у войску ў Рэмбертове пад Варшавай, міжваенны перыяд



У Кнаразах, справа: Анна Ваўрэнюк, Анна Красоўска, Анна Кірылюк, 1950-ыя гады



Кнаразоўскія дзяўчыны, злева: Анна Ваўрэнюк, Вера Паўлючук, Валя Паўлючук, Анна Красоўска, Анна Федарук, 1950-я гады



Францыі, працаваў у капальні вугля і тут яго заваліла. Малодшы ўтапіўся. На гэтым месцы не асталося нікога.

Адам Пучок

Жыў ён на ўсход ад хаты Капітанюка. Меў ён не вялікую ростам, але тоўстую жонку, якую ўсе называлі Пуччыхай. Была яна вельмі скупая, не згодлівая з суседзямі, сама трымала грашовую касу. Хаця два разы была меншая ад свайго мужа, але трымала за поясам свайго Пучка і была як бы поўнаўласнай гаспадыняй, а Пучок быў толькі як бы рабочым валом. Дзяцей у іх не было. Хатка была вельмі старая і гаспадарка не развівалася. Быў тут такі вузкі падворак, што завярнуцца з канём было немагчыма. Пасля першай сусветнай вайны ніхто з Пучкоў не вярнуўся з бежанства. Ніхто іх і не шкадаваў.

Томашыско...

Самога Тамашыска памятаю толькі па яго сівой барадзе і пад скобку абстрыжаных валасах. Добра памятаю вяселле яго сына Сэмэна з Карпавай Хвэдосяй. Але Хвэдося была бяздзетная і паводле старых законаў не магла быць поўнаўласнай гаспадыняй гэтай гаспадаркі. Адсудзіла сваю частку па смерці мужа і перайшла на пастаяннае жыццё да свайго брата Аляксандра Сідарука і толькі нядаўна памерла і пахавана з вялікай пашанай на могілках на Плоскай Гары.

Нейкі час жыў на гэтай гаспадарцы далёкі сваяк па лініі Тамашыска – Мацей з вёскі Катлы. Ён ужо памёр і не засталося нікога. Цяпер там жыве сын каваля Дмітра Красоўскага. Міхась Красоўскі доўгі час быў у палоне аж у Англіі. Жанаты на дачцэ Лапцева. Пры іх жыве яго маці Кацярына. Гаспадарка добра развіваецца.

Рыгорэць Кірылюк

Быў адным з найбагацейшых гаспадароў у Кнаразах. Меў ён аж паўтара ўчастка зямлі. Сям'я ў яго была вялікая і працавітая. Бацька ўмеў дзяржаць усіх пад строгай дысцыплінай. У яго было сем сыноў і дзьве дачкі. Найстарэйшага сына Езыфата аддаў у прыступы ў Кнаразах. Тымахвей цэлае жыццё пражыў у гор. Адессе. Толькі зрэдка ён прыязджаў на пабыўку, але сваім выглядам і багатай вопраткай адрозніваўся ад іншых сялян. Для Сідара, Хвэдося і Омельяна бацька даў па паўучастка зямлі і аддзяліў іх. Сын Аляксей пасучы валы каля ракі Арлянкі купаўся. Не ўмеў плаваць. Узяўся за хвост паўлавага Жука, пагнаў бічом, а вол як бы на зумысля павярнуў на глыбокае месца, затрымаўся каля высокага крутога берага ракі і Аляксей пайшоў на дно і ўтапіўся.

Лабасты Хілімон і малодшая сястра Хвядора памерлі ў Расіі падчас бежанства ў першую вайну, а старэйшая дачка Настуся была замужам за Дзямідавым Карнілам. Добра памятаю іх вяселле. Да апошніх дзён жыў толькі адзін сын Омельян. Больш як дзесяць гадоў быў ён зусім сляпы. Пражыў ён цэлых 82 гады. На гэтым месцы цяпер жыве ў асобнай хатцы Уліса з дачкою Вераю і ўнучкай ды сын Омельяна Міхась Кірылюк з цэлай сям'ёю. Міхась выбудаваў уласны прыгожы дом.

Калі мова аб гэтай гаспадарцы, то трэба адзначыць, што за клунямі пачынаецца ўрочыска Крыніця. Сюды сплывалі розныя нечыстоты з хлявоў, якія былі пажыўкай для ўзросту пенкнай травы на цэлым шырокім пляцу. Рыгарэць быў празорлівы гаспадар. Набыў дзесь прыгожую лысую кабылу, якая жыла больш як 20 гадоў і давала яму штогод пенкнага, каштанаватага лысага жэрэбца. Да гэтых жэрабцоў сяляне прыводзілі з цэлай



Коля і Таццяна Крышпінюкі, 1953 г.



Коля і Люся Сідорукі, 1967 г.



Ля дому Крышпінюкоў, 1965 г.

аколіцы кабыліцы. Тут было заўсёды два жарабцы. Адзін быў заўсёды на год старэйшы і яго Кірылюк прадаваў за дарагую цану, а на месца яго падрастаў другі. Заплату за пакрыцце Рыгарэць браў чвертку аўса, а свежую добрую траву касіў тут жа за клуняй на Крыніцы. Па апошнім жэрэбцу кабыла прывяла жаробку. Была яна ўжо сівай масці. Неўдалася і натурай да сваёй маці. Разбрыкалася яна з возам, панясла ў дарозе. Разбіла воз і парвала ўсю збрую і на смерць забіла свайго гаспадара. Такі быў канец яго карьеры.

Васілюшко Крышпінюк

Жыў калісь на ўсход ад Рыгарця. На тым жа панадворку жыў яго сын Сельвэстар Крышпінюк, Селевуліхам празывалі. Былі яны падзеляны. Кожны меў маленькую хатку пад адным саломаю накрытым дахам. Карысталіся толькі з чэтвэртухі ўчастка зямлі. Бацька каля 25 гадоў быў у царскай арміі. Быў удзельнікам аблогі Баязэту – крэпасці. Сельвестар быў не зарадным гаспадаром. Цяжкае было жыццё на такой маленькай гаспадарцы. Жылі яны не ў згодзе, а пры падзеле даходзіла да бойкі сына з бацькам. Падчас адной такой бойкі адзін аднаму адкусіў на руцэ палец. Не засталося цяпер нікога на гэтай гаспадарцы. Малодшы сын Васілюшкі Кондрат Крышпінюк пайшоў у прыступы да Прусачковай Ганны. Узяў сваю частку зямлі і цяпер там жыве. Сям'я Селвестра расплылася па краю.

Аноній Міколаюк

Яго празываюць Дэркачом. Да адзінай сваёй дачкі прыняў за зяця сына Пачтаровага Сэмэна Федарука. Аноній узяў жонку з Навасадаў, што каля Белавежскай пушчы. Атрымаў у пасагу дрэва. Пабудаваў новую хату і як першы ў Кнаразах пакрыў яе цынкавай бляхай. Калісь бацька Анонія Павел і яго брат Тымахвей жылі дружна і гаспадарка была пастаўлена вельмі добра. Каля хаты быў калодзеж-крыніца і тут жа за клуняй было ўрочыско Крыніца і вельмі добры сенакос. Павел трымаў прыгожых жэрэбцоў. Аноній не пайшоў у сляды бацькі. Цяпер зяць надрабляе залегласці гаспадарчыя.

Станіслаў Філімонюк

Нарадзіўся ён падчас ваеннай завірухі ў першую сусветную вайну. Бацькі яго Карп і Хвэдося былі праваслаўныя. А калі не было блізка ніякага бацюшкі, то дзіця павезлі да хрэсту да найбліжэйшага ксяндза. Каталіцкі ксёндз ахрысціў і даў яму як на злосць імя "Станіслаў". Такога імяні не было ў праваслаўных святцах і Стась, як яго ўсе называюць, не ведае, калі спраўляць свае імяніны. Другі раз не вазілі яго да хрэсту да праваслаўнага свяшчэнніка і так ён дажывае да старасці. Маліцца, ці да споведзі да касцёла ён ніколі не хадзіў, а лічыць сябе праваслаўным.

Некалі іншы быў у Кнаразах выпадак. Сын Наўма Іванюка – Нестар, пазнаёміўся і жаніўся з каталічкай. Ксёндз перад шлюбам зажадаў, каб ён прыняў каталіцкую веру і нанава яго ахрысціў, даючы імя Антоні замест Нестара. Не меў ён цягі да касцёла, а жонка не пазваляла хадзіць да царквы і вышла, як кажуць "Ні Богу свечка, ні чорту качэрга".

Дзед Станіслава Овтух быў вельмі паважаны ўсімі сялянамі. Любілі яго мужчыны, бо ён быў аматарам хаця б з кім нібудзь выпіць кварту гарэлкі. Была тут блізка карчма Носкі і тут прадавалася гарэлка па 10 капеек за кварту. Манапалькі тады яшчэ не было. Любілі яго жанчыны, бо ён меў вялікую пасеку пчолаў. Удзяляў жанчынам мёду, з якім варылі гарэлку пад хрысціны ці вяселле і заўсёды запрашалі і яго. Любілі яго і дзеці, бо ён частаваў іх



грушамі смалоўкамі і цытрыноўкамі, а часам выносіў на вуліцу тарэлку мёду. Калі быў пад хмельком, то забаўляўся з дзяцьмі і спяваў.

У яго была толькі адна вельмі прыгожая дачка, Гальжбетаю звалася. Да яе ён прыняў зяця Кондрата Хілімонюка з Кожына. Гэта быў чалавек высокага росту. Здаровы і надта прыгожы ды разумны. Жылі яны вельмі дружна, хаця зяць не любіў водкі. Тут быў мой аднагоднік Аляксандр. Мы разам забаўляліся ў пясочку. Разам прызываліся да войска. Пасля ён пайшоў у прыступы да Курашава і памёр у маладым узросце. Памятаю, калі мне было 6 ці 7 гадоў, я зайшоў дахаты свайго кампана Аляксандра. Сярод хаты вісела плецяная з лазы калыска, а ў калысцы дзіця. Калі дзіця заварухнулася і пачынала плакаць я стаў калыхаць яго. Гэта была дзяўчынка Елізавета. Маці яе Гальжбета і кажа: “Калышы, калышы сынку, можа калі будзе тваёй жонкай”.

Здарылася так, што я пайшоў, як кажуць у людзі, то ў навуку, то на службу, то да войска, і калі я быў ужо ва ўзросце каля 25 гадоў і заехаў на водпуск да сваіх бацькоў, то пабываў на вясковай забавепатанцоўцы. Тут вельмі спрытна ўвівалася надта прыгожая стройная дзяўчына, якая звалася Елізаветай. Я ўспомніў словы яе маці, але яна была багатых бацькоў, а я, хаця працаваў ужо як настаўнік у школе, але быў як кажуць малазямельным і не мог марыць пра шлюб з ёю. Яна аж тры разы выходзіла замуж. Яе першы муж Іван Артэмюк забіты на вайне. Другі Матхвей Паўлючук памёр з чахоткі, трэці Дзяніс Томашук памёр ад старасці і цяпер яна як 70-ці гадовая жанчына, ўдава, каратае сваё ненайлепшае жыццё.

Я ж больш 30 гадоў працаваў як настаўнік у школе. 53 гады жыву са сваёй жонкай Марысяй. Цяпер маю 79 гадоў. Атрымліваю пастаянную месячную пенсію, якую ў выпадку маёй смерці будзе атрымліваць мая жонка. Так што лёс старасці здаецца пераважыў у маю старану.

Як я ўжо зазначыў, цяпер на гэтай гаспадарцы жыве і працуе Стась Хіліманюк. Трэба сказаць праўду, што гэта вельмі разумны гаспадар. Доўгі час ён быў солтысам. Сям'я яго дружная і працавітая. Гаспадарка пастаўлена вельмі добра. Прыгожыя будоўлі, тут жа сад школа – разсаднік дрэвак як яблыні, грушы і слівы. Так як яго сусед Рыгарэць калісь трымаў прыгожых жэрэбцоў, так Стась трымае заўсёды свайго кнура і вялікае стада свінней. Шмат накашвае зялёнай травы на Крыніцы. Умее добра спланаваць засевы на полі. Збірае высокія плёны бульбы, буракоў, бруквы. Стасуе сіласаванне зялёнак. Мае заўсёды пад дастаткам пашы і вельмі добра шанцуе яму гадоўля. Ён не скардзіцца на неаплацальнасць гадоўлі хатняй жывіны. Сын Аляксей трагічна памёр на чыгунцы ў Хожове. 14 лютага пахаваны на могілках у Кнаразах.

Мірон Кононюк і Саўка Кононюк

Гэта былі родныя браты. Жылі яны каля Стася Хілімонюка. Бацьку Якуба яны аддалі ў прыступы да Гароднічкі. Быў тут сын Дорохвей, які пайшоў у прыступы да вёскі Катлы і цяпер там жыве. Мірон узяў жонку Параску ад Вялічкі з Пасынкаў. Саўка амаль цэлае жыццё быў на службе ў Ленінградзе і толькі пад старасць вярнуўся да бацькоўскай хаты без ніякага забязпечання. У Мірана быў сын Сямён, які астаўся малым пасля бацькі. Была тут яшчэ сястра Мірана і Саўкі, кульгавая цётка Оксэнна і Марыся. Дзядзька Саўка трымаў апеку над цэлай гаспадаркай. Саўка быў старым кавалерам. Не піў водкі, не курыў і добра дапамагаў для Сямёна ў працы.

Новая хата накрыта гонтам. Гаспадарка пастаўлена добра.

Тымахвей Кононюк і яго сын Нестар

Жыў на тым жа ўчастку, што Мірон і Саўка, але асобна гаспадарылі. Хата стаяла каля самай прагулкі. Брат Тымахвея – Янэчка Кононюк служыў у царскай арміі 25 гадоў і атрымаў цэлы гэктар агароду тут жа насупраць хаты Тымахвея. Падчас бежанства ў першую сусветную вайну з немцамі, яго ўся сям'я і сам Янэчка паўміралі і агарод перайшоў па спадчыне ва ўладанне сына Тымахвея Нестара Кононюка, якога не ведаю чаму называлі Журам. Асаблівы гэта быў чалавек. Ніколі не ўжываў мацерных непрыстойных слоў і кожнаму толькі дапамагаў. Каля самай прагулкі на панадворку ў яго быў сад з добрымі грушамі і слівамі. Калі хто з волапасаў гнаў прагулкаю на пашу валы і шпурнуў кіем па грушы, а Жур заўважыў, то ніколі не ганіў, а заўсёды толькі "Но і даті дам колі злапаю".

У Нестара быў брат Дземян, але не памятаю, дзе ён падзеўся і другі брат Ігнат, які пайшоў у манахі ў Кіева-Пячэрскую Лаўру і больш ніколі сюды не з'яўляўся. Дачок і ўнучкаў Нестара і цяпер прazываюць Журанкамі.

Карчма

Па другі бок прагулкі на агародзе Аўксенція Корнілюка стаяла калісь вялікая, вельмі старая карчма. Жыў тут жыд Носка і яго сын Бэрка. Ніхто не ведае яго праўдзівага прозвішча. Носка трымаў каня. Ездзіў па сёлах, скупляў некаторыя тавары, вазіў да Бельска, а часцей да Беластока. Адтуль прывозіў бочку гарэлкі, бочку піва, квасу і розных тавараў, такіх як следзі, соль, запалкі, махорку, цукар, перац і ўсё, што найбольш патрэбнае было ў вёсцы. Яго жонка Ханя, сын Бэрка, дачка Сёрка і дачка Рэйза былі заўсёды дома і памагалі таргаваць, шылі кофты для дзяўчат, а калі некалі і забаўляліся з хлопцамі. Ханя добра ўмела выпякаць смачныя пшанічныя булкі па 2 грашы і смажыла на льняным алею следзі. На гэтым яна бадай найбольш зарабляла. У карчме было шмат маленькіх камнатушак і адна вельмі вялікая саля, абстаўляная навокал лавамі, сталамі, а нават скрынкамі для тавараў. Тут пілі гарэлку, піва, часам віно, квас і заўсёды прыходзілі сюды ўсе вясельныя ці з хрысцін госці і тут як казалі "полоскалі зубы". З гасьціма прыходзіў музыка са скрыпкаю Ігнат Ярашук і рэзаў са ўсіх сіл заказаны вальс ці польку, якія тады былі тут наймаднейшыя. Тут на цаглянай падлозе некаторыя так моцна прытупвалі жалезнымі падковамі гапака, што аж іскры сыпаліся. Тут жа ў гэтай жа сені адбывалася чыста жыдоўская вясельная ці іншая забава, напрыклад калі каваль Мэер аддаваў замуж за кавалера з Бельска сваю дачку Хайку.

У адным з маленькіх пакояў Носка з Хайкаю спалі, і зімою, і летам пад пярынаю. У другой спалі дзьве дзяўчыны і таксама пад пярынай. У трэцяй спаў сын Бэрка. А ў чацвертай Ханя трымала пад замком усе лакомыя рэчы, як цукеркі, цукар, папіросы і грошы. У святочныя зімовыя вечары ў агульнай салі заўсёды было шмат мужчын. Тут былі розныя казкі, прыказкі, забавы. Напрыклад Конон Герасімюк падняўся з'есці без хлеба 10 следзяў проста з бочкі не вымачаных, а нават не памытых. Выйграў ён заклад, з'еў гэтых 10 следзяў, а заплаціў за іх той хто прайграў заклад. Хтось іншы падняўся з'есці 12 булачак і таксама выйграў заклад. Шмат грошай атрымліваў Носка за свае тавары. Але другога склепу не было. А хітры жыд добра ўмеў выкарыстаць кожную аказыю.



Злева стаяць: Іван Стэпанюк, Люба Ніколаюк, Ірына Андрэюк, Рыгор Ваўрэнюк, Люба Іванюк, Валя Ніколаюк, Анна Ваўрэнюк; сядзяць: Надзя Іванюк, Валя Паўлючук, Маня Артэмюк, Вера Паўлючук, Ніна Корнілюк, 1950-ыя гады



Анна Кірылюк, Валя Іванюк, Вера Паўлючук, 1953 г.



Памятаю як Носка прыехаў з Бельска і прывёз некалькі маленькіх календароў. На першай вокладцы была выява цара Мікалая II і яго жонкі, а далей месяцы і дні цэлага года. Ніякіх практычных парад тут не было, як толькі песня “Боже Царя храни”. Быў тады тут адзін селянін Рэгарам яго звалі. Носка ўзяў гэты каляндар, паднёс блізка да Рэгара і кажа жыдоўскім жаргонам “Раўр купі ў мяне каляндар і гасудар”. Рэгар не доўга думаючы, а голас быў у яго вельмі грубы, адказаў “Поцілуй ёго в сраку”. Усе прысутныя вельмі зарагаталі. Носка як бы засароміўся. Але хутка ўзяў кажух. Апранаецца і кажа, што паедзе да ўрадніка і скажа як Рэгар абразіў цара і цэлае царства. Тут некаторыя ўмяшаліся нібы каб было ціха. Дайшло да згоды. Рэгар заплаціў за каляндар 5 капеек і за цэлую кварту гарэлкі.

Шмат іншых цікавых момантаў адбывалася ў гэтай карчме. Тут праходзілі агульныя сходы сялян зімою, бо летам такія сходы адбываліся пад вязам на траве насупраць карчмы. Тут у карчме дагаворваліся з грамадскімі пастухамі і зносілі ім збожжа за мінулае лета. Тут прапівалі грошы некаторыя мужчыны пакрыёму ад сваіх жон. Тут часта збывалі так званых “тхароў”, гэта значыць украдзеных з гаспадаркі некалькі кілаграмаў збожжа на водку. Але жоны сталі бунтавацца. Байкатавалі Носкавы тавары і зажадалі ад Аўксенція, каб забраў з яго агарода карчму. Носка мусіў перанесці карчму на самы канец, пад Зубава. Але сюды не так зручна было хадзіць мужчынам. Падрос сын Носкі Бэрко, ажаніўся ў Бельску і пабудаваў вялікі дом, які і цяпер стаіць яшчэ на вуліцы Міцкевіча. Уся сям’я стала ахвярай гітлероўскай акупацыі ў апошнюю вайну.

Іван Крышпінюк, сын Аўксенція і яго брат Дмітры Корнілюк

Пабудавалі яны свае хаты акурат на тым месцы, дзе калісь была Носкава карчма. Нарадзіліся яны не тутака, а там дзе калісь стаяла старая хата бацькі. Там цяпер стаіць хата Антона Паўлючука. Аўксенты быў сам гаспадар на цэлы ўчастак. Шмат працы трэба было ўлажыць, каб утрымаць гаспадарку на ўзроўні. Аўксенты быў чалавекам рэлігійным. Не лічыў за цяжкасць нясці крыж ці харугві падчас працэсіі, пры поховінах нябожчыка ці дзе яшчэ. Быў чалавекам спакойным, сумленным і ніколі ні з кім не сварыўся, а тым больш ніколі не ўжываў не прыгожых слоў. Сыны яго значна лепш вядуць свае гаспадаркі. Кожны мае прыгожыя будоўлі, кожны мае свой уласны сад. Ёсць яшчэ тут старая панна Кацярына, якая добра памагае ў гаспадарцы.

Ваўрэн Стэпанюк

Быў вельмі старым чалавекам. Такімі самымі старымі былі яго ўсе будоўлі. Меў ён цэлы ўчастак у добрым палажэнні зямлі. Гаспадарку на ім вёў яго сын Янушко Стэпанюк. У Янка і яго жонкі Даркі было тры сыны: Кузьма, Якім і Мефодій, а ў брата Даніла не было дзіцяці. Жылі яны не ў згодзе. Янко лічыў, што толькі ён мае эгаістычнае права на жыццё. Хацеў быць не толькі найважнейшым у гаспадарцы, але норавіў вясці рэй у цэлай вёсцы. Быў зусім непісьменны. Без перапынку курыў сваю люльку. Калі капалі тут калісь драўляны калодзеж, то ніяк не маглі дакапацца да вады. Была тут глыбокая гліна. Усе старыя агульныя справы Кнаразоў ён стараўся залагодзіць кулаком, а калі трэба было, то прызываў з дапамогай сваіх жа сыноў. Якіма аддаў у приступы да Каравайчыка. Кузьму ажаніў, але калі хутка па-



Лідзія Федорук, Рыгор Томашук і Валя Капітанюк, 1960 г.



Злева: Ніна Клімюк, Вера Крышпінюк, Анна Дмітрук, Ольга Крышпінюк, Ольга Крышпінюк, Анна Красоўска, 1960 г.



Рыгор Томашук



Пахаванне Івана Сідорука, ідзе а. Міхаіл Міцэвіч, 1958 г.

мерла яго жонка, то не пазволіў жаніцца. Дажывае да старасці пры браце Мефодыі.

Кузьма Андрэюк

Яго празывалі Шабельбай. Жыў сам на сваёй гаспадарцы. Пасля яго быў адзіны сын Ігнат Андрэюк. У бацька Кузьма і сын Ігнат жылі ў добрай згодзе. Абодва яны любілі час ад часу выпіць кілішак гарэлкі, былі схільны да вясёлага жыцця. Добра ў іх ішла гаспадарка. Але хатку яны мелі бадай найменшую ў сяле. Жонка Ігната – Аксенія Кручка з Пасынак. Была яна не вялікага росту, але вельмі прыгожая і працавітая. Было ў іх тры сыны: Кондрат, Кірыло і Іван. Кондрат пайшоў у прыступы да Зубава, а малодшыя браты і цяпер жывуць у новапабудаваных хатах на поўчастцы кожны. Іван працуе яшчэ як добры кравец.

Калісь сустрэла гэтую сям'ю вялікае гора. Кузьма, Ігнат, зяць Сахарко і Сяргей Савіцкі супольна моцна пабілі Сельвестра Ваўранюка, якога Сычом празывалі. Пабілі яго не без прычыны. Сельвестр быў вялікага росту, карэнасты, сільны і кожнага ў паедынку мог пабіць і ён не раз ужываў гэтага спосабу расправы. Быў пры гэтым вялікім эгаістам, шкоднікам. У полі ён ад суседа прыворваў лішнюю скібу зямлі. На сенакосе перакошваў сена. Ніхто яму не мог нічога сказаць, бо баяўся пабояў. Кузьма, Ігнат, Сахарко і Савіцкі згаварыліся, можа і выпілі для рэзыкі і так пабілі Сыча, што ён да канца жыцця не мог працаваць на гаспадарцы. Хадзіў па падворку, кашляў і пасля памёр. Ніхто ў сяле яго не шкадаваў. Але суд усіх чатырох саўдзельнікаў засудзіў на безтэрміновае вольнае пасяленне ў Сібір. Маглі яны забраць з сабою і свае жонкі і сем'і. Але жоны сказалі, што яны не зрабілі ніякага злачынства і не хочуць добраахвотна накладаць на сябе кару.

За чатыры гады кожны з іх ў Сібіры збудаваў хату і іншыя гаспадарчыя будоўлі. Кожны абзавёўся жывёлай, а што яны здаровыя і працавітыя, то хутка сталі яны жыць у Сібіры лепш як у Кнаразах. Калі нарадзіўся наследнік расійскага царскага прастолу Аляксей, то цар выдаў маніфест, што кожны меў права вярнуцца на сваю бацькаўшчыны. Яны прыехалі, але не з тым, каб тут працаваць на сельскай гаспадарцы, але з тым, каб забраць свае жоны і сем'і на гаспадаркі ў Сібір. Жоны і на гэты раз не захацелі ехаць і яны таксама засталіся ў Кнаразах.

Шмат чаго новага прывезлі яны з сабою з Сібіры. Мелі яны больш лепшых спосабаў гаспадаравання. Замест вазоў на драўляных восях, яны справілі сабе вазы на жалезных восях. Былі яны прыгажэйшыя, мацнейшыя, лягчэйшыя на ходу і не скрыпелі так голасна, як скрыпелі драўляныя. Замест драўлянай сахі зрабілі яны жалезныя плугі. Замест валоў ці кароў, гэтыя плугі цягнулі коні. Замест драўляных, плеценых барон, пайшлі жалезныя бараны. Поле мела лепшую апрацоўку. Сталі збіраць большыя ўраджаі з палёў. Жыццё усіх сялян стала станавіцца што раз лепшым. Тут можна было б прымяніць усім вядомую прыказку "Няма таго злога, каб на добра не выйшла". Але жоны не мелі таго мужаства і смеласці. Не паслухалі сваіх мужчын. Гэта значыцца не было ў іх праўдзівага кахання і прывязаннасці да сваіх мужоў.

Ігнат Томашук

Яго празывалі Свэрэнка. Быў ён вельмі паважаным чалавекам. Трымаў заўсёды вельмі вялікае стада гусей. Калі яго пыталі, чым і як ён іх корміць, што такія заўсёды ўданыя, ён поўжартам адказваў, што калі рэжа ў сячкарні салому на сечку для каней, то перад гэтым адлятаюць каленцы. І ён

гэтымі каленцамі нібыта карміў гусей. Усе ведалі, што ён корміць аўсом, але не кажа праўды. Жонка яго была чырвонаносая. Вельмі любіла гарэлку.

Пасля смерці бацькі гаспадарку вёў яго сын Якуб Томашук. Быў ён гарбаты, відавочна ад непамернай працы. Жонка яго была з Сакоў. Вельмі мілая і прылюдная жанчына. Іх сын Лукаш вучыўся ў Свіслацкай Настаўніцкай Семінарыі. Вёў на сваім агародзе вялікую плянтацыю агуркоў. Рабіў цікавыя дасведчанні з пасевам травы на заараным торфе. Працаваў нейкі час настаўнікам. Залажыў на сваёй калёніі аграмаднейшы сад з найлепшымі сартамі яблык. Як першы ўжываў штучныя ўгнаенні. Апрыскваў сад. Але хутка памёр. Прагрэсіўны гэта быў чалавек.

Пахоній Андрэюк

Быў падобны да ўсіх гаспадароў. Празывалі яго Баглїём. Яго старшы сын Сяргей Андрэюк пад канец жыцця быў без нагі. Хадзіў на кулях. Быў пісьменны. Яго жонка была з Пасынак. Не любіла працы, але кожны ранак абыходзіла ўсіх сваіх суседак. Збірала навіны, дабаўляла, часам пераіначвала факты. Адным словам, усе яе называлі пляткаркай. Ня ведаю чаму яе празывалі Пахонійчай. Былі тут яшчэ два браты блізнюкі Даніла і Себасцьян. Загінулі падчас першай вайны. На гэтай гаспадарцы цяпер жывуць Пятро і яго брат Уладзімір Андрэюкі, які ёсць даўжэйшы час солтысам у вёсцы, а Пятро сторажам пры складзе пашы трэсцівай для кароў. Кожны з іх мае сваю ўласную сям’ю, сваю хату і іншыя будоўлі. Кожны жыве асобна.

На гаспадарцы Паўла, Нестара і Данілы, якіх празывалі Пштыкамі, пасля вайны ніхто з бежанства сюды не вярнуўся. Даніла быў найвышэйшага росту ў Кнаразах. Жыў тут са сваёй сям’ёю Пятро Лапцев. Ён быў добрым хайструном. Пакладаў пераважна жэрэбцоў. Паходзіў Пятро з Віленшчызны. Гаварыў ён заўсёды чыста беларускай мовай з націскам на дз., як хадзіў, глядзеў. Сыны яго Юзік і Алёшка жывуць у Бельску. Паўлік жыве ў Кнаразах на сельскай гаспадарцы. У Бельску маюць прыгожыя дамы. Тут радыё, тэлевізары, лядоўкі, пралькі. Дачка Пятра замужам у Кнаразах за Красоўскім. Па смерці бацькі яны пляц прадалі, а дом перанеслі на пляц майго бацькі. Тут жывуць дзеці майго брата Рыгора Перэвоя.

Габрэль Данілюк

Доўгі час трымаў вялікага пярэстага каня. Ну проста як карова. Добра памятаю і на свае вочы бачыў, як Габрэль вывазіў на Перадлазніску падчас сенакосу сена цераз раку Арлянку. Рака тады была не ўрэгуляваная. Сенакосы былі вельмі забалочаныя. На самым беразе ракі дарога была разгружаная. Конь заграз у балоце. Два-тры разы штурхануў носам у балота і ўтапіўся. Яго ўжо не жывога перацягнулі праз раку. Тут ён нейкі час ляжаў, а пасля яго закапалі. Хутка потым зрабілі адну грэблю праз Пэннэчко да Астраўка, а другую праз Мутвіцу на Дубно. На грэблі гэтай цэлай вёскай было навезена шмат каменьня, а на каменне зямлі з Багна. У Габрэля быў сын Сахарко і Ульян, які вельмі добра іграў на скрыпцы. Ульян быў старым кавалерам. Габрэліха засталася ўдавой. Вяла яна раманс з Артэміям Крышпінюком. У таямнічы спосаб прапаў Ульян. Шмат было здагадак, але суда не было.

Сэльвестар Ваўрэнюк

Празывалі яго Сычом. Сэльвестар – гэта той, якога моцна пабілі Сахарко, тэсць Кузьма, швагар Ігнат і Савіцкі. Па суду яны былі сасланы на безтэрміновае вольнае пасяленне ў Сібір. Не вельмі то была разумная палітыка цара. Калі ішло

аб засяленні абшараў Сібіры, то трэба было высылаць туды засуджаных разам з сем'ямі. Можа нават даваць дапамогу на загаспадарванне. Самі мужчыны прыросту насельніцтва не даюць. Патрэбны тут былі і жанчыны. Тым больш, што ў Кнаразах адчуваўся вялікі зямельны голад, а з другога боку астаўшыяся жоны, як бы з полусіротамі дзяцьмі перажывалі найгоршыя няшчасці. Гаспадарка марнела...

У Сэльвестра быў сын Рыгор, які нічым не адрозніваўся ад свайго бацькі і другі сын Андрэй, які доўгі час працаваў як жалезнадарожнік. Трэці брат Фёдар быў у прыступах у Кузьмы Іванюка.

Андрэй Маркоўскі

Быў ён вельмі працавіты чалавек. Зямлі ў яго было цэлы ўчастак. Сям'я вельмі малая. Расказвалі, што ён толькі ў святы абедаў у хаце за сталом, а то заўсёды еў калі ехаў па снапы ў поле, па сена на сенажаць ці па бульбу. Была ў яго жонка Кіліна, якая спачатку не магла, але вельмі хацела мець дзяцей. Малілася, пасылала ахвяры да манастыроў, а пасля асабіста паехала да Кіева-Пячэрскай Лаўры. Хутка забярэменіла і радзіла дачку Анастасію. Пасля яе выдала замуж за Аляксандра Адамюка з Пасынак, якога празываюць "Плютай". Сын Трахім па першай жонцы памёр бяздзетна і цэлая гаспадарка перайшла да Адамюка. Цяпер у Кнаразах на гэтым месцы нічога не засталося. Зямля раскуплена малазямельнымі гаспадарамі. Лесам і тарфавіскам карыстаецца Адамюк і яго вялікая сям'я.

Кузьмуль Ваўрэнюк

Быў гэта чалавек вельмі працавіты і справядлівы. Расказваў мне бацька, што для Кузьмуля заўсёды даручалі дзяліць сваім касіскам сенакосы на шахаўніцы. Збіраў ён ссыпку збожжа для грамадніх пастухоў і ніколі нікога не абманваў. Жыў бедна, бо меў вялікую сям'ю. Памёр ён у вялікай старасці. Цяпер на гэтай гаспадарцы жыве яго сын Сяргей, якому ўжо 90 гадоў. Праўдзівым гаспадаром тут ёсць яго сын Гарасім. Паставіў Гарасім новую прыгожую хату, бо хоча памерці ў той самай, у якой нарадзіўся. У Сяргея быў брат Якім, стары кавалер. Ужо даўно памёр і быў яшчэ брат Пракоп, які з цэлай сям'ёй выехаў да Гродна. Пракоп нядаўна памёр, а Жоржык, Мітька і Андрушка з сем'ямі і цяпер жывуць вельмі добра ў Гродне. У Кнаразах хата Сяргея бадай найстарэйшая, якую варта паглядзець, як яна абсталявана ў сярэдзіне. Гэта праўдзівы музей мінулага.

Паўлюль Леўчук

Ён заўсёды быў фактарам і памочнікам у купцоў-жыдоў, якія ў жніва прыязджалі і масава скупоўвалі маладыя, але добра выросшыя гусі ва ўсёй вёсцы. Плацілі па аднаму рублю ад штукі. А трэба ведаць, што калі была шахаўніца, то кожны гаспадар трымаў стадка 5-6 старых гусак і аднаго гусака і разам з гусянятамі выпасаў іх на так званым угоры. Пасля бацькі жыў тут Васілько Леўчук. Меў ён цэлы ўчастак зямлі, але вельмі быў не зарадны. Жыў бедна, але вельмі доўга, можа 90 гадоў. Нядаўна толькі памёр. Яго сын пайшоў у прыступы да дачкі Якіма Стэпанюка і цяперака жыве. Васілько пасля камасацыі быў выбраўся на калёнію пад Суботку, але падчас акупацыі немцы перасялілі яго на калёнію Ігара Нічыпорука. Хата і цяпер там стаіць.

Рэгар Федорук

Быў высокага ўзросту. Насіў заўсёды пад скобку пастрыжаныя валасы. Гаварыў вельмі грубым голасам. Часта выпіваў і спяваў не вельмі прыемныя пахабныя



Ольга Крышпінюк у садку Красоўскіх



Вера і Марыя Крышпінюкі



На вяселлі Андрэя Крышпінюка, 1970 г.

песні. Дрэнны быў гаспадар. Жыў бедна на поўчастку. Таксама бедна жылі яго сыны Макар і Фаддэй, але ўжо паўміралі. Рэгурча жыла вельмі доўга. Яна аддала адну сваю дачку да Плютыч, другую за Наумова Хвэдося Іванюка, а трэцюю за сталяра да Бельска. Пасля і ўся сям'я прадала гаспадарку ў Кнаразах і купілі пляц на вуліцы Дубічы нр 2 і пабудавалі супольны дом. Падчас вяселля была ў Кнаразах цікавая гісторыя. Тады яшчэ мала было таксовак. Не кожны нават бачыў яе. Малады прыехаў да Кнаразоў таксоўкай, каб паехаць разам з Маланіей да шлюбу. Шофер увайшоў дахаты, каб выпіць і закусіць, а хлопцы вельмі цікавіліся, як гэтая машына зроблена. Рэгарча абсыпала з вечка аўсом вясельных і таксоўку. Хтосьь насіцнуў на пэўны гузік і таксоўка без шофера ўцякла з падворка. Чуць яе злавілі. Але пасля доўга гэта было тэмай размовы сярод моладзі і старэйшых.

Янка Федорук і яго сын Тодорко Федорук

Жылі яны каля Рэгара. Тодар быў падслепаваты, а яго сын Хілімон і зусім аслёп яшчэ ў маладым узросце. У Янка быў яшчэ сын Сахарко, стары кавалер і сын Уладзімір, які пайшоў у прыступы да Козлікаў. Сахарко вельмі спрытна ўмеў красці ад каравайніц гускі з печы. Але то не лічылася грахом ці праступкам, а толькі трэба было мець спрыт, каб украсці гуску і не атрымаць гуза на лбе ад доўгай кацюбкі каравайніцы. Сахарка быў таксама вялікім аматарам співаць пераважна набожныя песні. Быў ён малапісьменны, але быў на вёсцы вялікім рэгентам і кампазытарам. Пераважна каля яго хаты, проста на лаўцы, на каменнях ці стоячы збіралася моладзь, а нават некаторыя мужчыны і жанчыны. Яны хорам спявалі, ды так стройна і галасна, што нават у суседняй вёсцы Зубава было добра чуваць. Адсюль вывад, што нават і тады была цяга да агульнага спеву.

Карп Сідарук

Гаспадарыў ён на цэлым участку зямлі. Быў вельмі паважным чалавекам. Ніхто ніколі не бачыў яго п'яным. Меў ён дружную і працавітую сям'ю. Не ведаю чаму яго называлі Балоксонам. Быў набожны. Можа і скупы, але часта выказваў сваю дабрату для бяднейшых людзей, як бы напаказ. Даваў ён часта для пастуха такую вялікую лусту хлеба ці пірага, што яна не памяшчалася у пастушай торбе. Пастух мусіў праз усё сяло несці яе на руцэ. Кожны іншы гаспадар гэта бачыў. Дарыў ён і жабраючых людзей. Можа яшчэ больш быў паважаны яго сын Аляксандр. Другі сын Карпа – Сэмён жыў больш грэшна, але і памёр смешна. Проста памёр седзячы абапертым аб плот, пасучы авечкі ў полі. Усе сыны, унукі і праўнукі вельмі цэняць навуку, паводле якой вядуць свае гаспадаркі. Жывуць вельмі заможна, культурна і згодна. Тут ніколі не пачуеш дрэннага слова.

Павел Капітанюк

Быў ён суседам Карпа, прыступам з вёскі Агароднікі. Жонка яго была хваравітая, а нават былі ў яе прыступы псыхічнага разстройства. Можа таму, што капітан заўсёды п'янстваваў, буяніў, не пільнаваў гаспадаркі і не дбаў аб сям'ю. Хутка памерла яго першая жонка. Аставіла яна вельмі прыгожую дачку Кацярыну, роўна гожую Ольку, але яе твар быў пашпэчаны чорнай оспай і дачку Надзю. Кацярына выйшла замуж за каваля Дзмітра Красоўскага, яшчэ і цяпер жыве. Да Олькі прыступіў Андрэй Ніколаюк, а Надзя вышла замуж ў Савецкі Саюз і цяпер там жыве. Другой жонкай Паўла была Стахвіёва Палашка. Памерла яна бяздзет-

на. На гаспадарцы гэтай цяпер жыве прыступа Алёшка Стэпанюк і яго жонка Вера. Зусім іначай выглядае тут гаспадарка. Добрыя ўсе будоўлі. Ёсць камплект машын. Прымяняецца сіласаванне пашы. Добра ідзе гадоўля. Ёсць прыгожы сад, а ў садзе цыбуля і іншыя варыва. Алёшка трагічна памёр, замёрз.

Васіль Федорук, сын Міронця

Падчас камасацыі выбраўся на калёнію Зубава, але немцы змусілі зноў пасяліцца ў сяле. Недаўна памёр, пасля аперацыі на рака жалудка. Быў дбайны гаспадар і цяжка працаваў. Асабліва цяжка працавала яго жонка Тэкля. Аднак не меў ён шчаслівага сямейнага жыцця. Цяпер тут жыве яго дачка Ольга са сваім мужам Міхасём Федоруком. Другая дачка Марыся вельмі неўдачна выйшла замуж да Гайнаўкі, але яе муж больш жыве ў турме, чым дома. Не шчаслівa жыве і Тэкля. Можа ўкляла гэты дом Надзя Перэвой, на агародзе якой немцы Васіля павесілі, а вярнуцца на калёнію ён не мог, бо такая была палітыка сацыялістычнага гасударства.

Нестор Перэвой, сын Дзяніса, прыступа з вёскі Агароднікі

Гэта мой бацька. Маці Анастасія Міхайлаўна Герасімюк была, як кажуць дзядзічкай. Усе мы радзіліся ў старой хатцы, якая стаяла там, дзе цяпер пабудаваны Алёшка Хілімонюк. Калісь насупроць нашай хаты, сярод вуліцы быў глыбокі калодзеж. Бацька мой прыйшоў на зусім занядбаную гаспадарку, але быў вельмі працавіты. Спачатку паставіў з новага дрэва клуню, бо не было ніякай, пасля хату і хлявы. Ды перабудаваўся зусім на свой агарод, дзе калісь быў так званы коворот, ці брама, якая нанач замыкала вуліцу.

Было нас чатырох сыноў: Грыгорый, Нестар, Феадосій і Сцяпан. Усе ўжо памерлі, застаўся толькі я Нестар і пастанавіў апісаць жыццё цэлай вёскі, а аб сябе дакладней апішу асобна. Цяпер тут жывуць дзеці старшага брата Рыгора: Хведар, Надзя і Олька. Старая бацькоўская хата стаіць пустая. Пастаўлена новая хата ад Лапцевых.

Бацька мой быў, як кажуць, на ўсе рукі майстар. Рабіў каменныя крыжы-памятнікі на магілы. Рабіў жорна, будаваў новыя хаты і іншыя будоўлі. Умеў рабіць сталярку. Зрабіў прыгожую шафу, якая і цяпер стаіць у старой хаце і можа быць экспанатам да будучага музея. Памёр бацька ў 1915 г. на 57 годзе жыцця. Пахаваны у Пасынках, а маці на Плоскай Гары.

Як я адзначыў, бацька мой прыйшоў на зусім занядбаную гаспадарку. Ото ж, мой дзед Міхась і Якім былі братамі. Калі пажаніліся, то падзялілі ўчастак зямлі па роўну, бо такое было права. Дзед збудаваў асобную хатку, а Якім астаўся ў старой. Доўга жылі аддзельна. У майго дзеда была толькі адна дачка Анастасія, а ў Якіма была вялікая сям'я. Калі памёр мой дзед, то Якім зажадаў, каб мая бабка Зіновія з дачкою перайшлі зноў да яго хаты. Ён дэкляраваў выпасажыць маю маці, дагадаваць да смерці бабку, а зямлю прыгарнуць сабе. Яшчэ пры падзеле вельмі крыўдзілі маю бабку і маці, і таму яны ніяк не хацелі аддаць зямлю і перайсці да Якіма. Тут пачаліся суды, якія аж 12 гадоў цягнуліся. Тут былі непамерныя, судавыя кошты, пошліны, аплата адвакатаў, пачастунак для сведкаў і шмат іншых з тым звязаных выдаткаў. Такую простую справу раз на заўсёды можна было разсудзіць на працягу двух гадзін. А справу разцягнулі і вызысківалі няшчасных жанчын на працягу 12 гадоў. Ці ж гэта не карыгодная палітыка суддзяў і адвакатаў таго часу. Такія то былі калісці часы, што меў права да жыцця толькі сільнейшы і багацейшы.



Семенюк Уладзімір і Семенюк Андрэй

Былі гэта родныя браты. Бацька іх быў Янко Семенюк-Гапчуком празывалі. У Янка быў брат Васіль, які цэлае жыццё быў гарадавым у оберпаліцмэйстра ў Варшаве. Часта ён прыязджаў у водпуск да брата. Дапамог Янкаві выбудаваць найпрыгажэйшую таго часу хату. Быў непамерна тоўсты, з агромным жыватом. З высока глядзеў на кожнага селяніна або жанчыну, якая вітаючыся мусіла цалаваць яго руку. Нешчасліваю ён меў старасць. Рана памерла яго жонка. Памёр таксама адзіны сын. Першая вайна раскідала па свеце яго дочак Марыю, Наталію і Надзю. Васіль не меў ужо пасады. Пасяліўся ў Кнаразах у брата. Пахудаў да непазнавальнасці. Іначай стаў абходзіцца з людзьмі. Бяда змусіла яго пасці стада авечак з цэлай вёскі, а тут ногі ўжо не хацелі слухацца яго, каб бегчы. Памёр ва ўзросце каля 75 гадоў. Уладзімір і Андрэй і цяпер жывуць і кожны мае сваю хату і сваю гаспадарку. Уладзімір носіць доўгую, сівую бараду.

Нічыпор Федорук

Яго празывалі Файбелем. Жонка была з дому Кондрата Дмітрука. Жылі яны бедна. Была ў іх дачка Настуся, як раз мая аднагодка. Вельмі яна мне падабалася не прыгажосцю, а сваім характарам, адносінамі да мяне і ветлівасцю да ўсіх людзей. Вельмі часта я бываў у іх доме. А бацькі яе так мне падабаліся, што мне здаецца, як бы яны былі для мяне роднымі. Пайшла яна замуж да вёскі Рыбалы.

Сын Нічыпора Борыс ўзяў жонку з Рыбалаў Вольгу Паўлаўну. Гісторыя гэтай жанчыны вельмі цікавая. Мела яна аднаго сына, якога забіў фураю Рыгор Вязоўскі і другога Паўла ды тры дачкі: Лідзію, Гапку і Вольгу. Рана памёр Борыс, заставіў удаву з чатырмя маленькімі дзяцьмі. Гаспадарка была маленькая, усяго 1/4 участка зямлі. Вялікае гора цярпела яна. Ні адкуль не атрымлівала яна ніякай дапамогі. Сама цэпам малаціла снапы збожжа. Гэта было за санацыйнай Польшчы. А калі паўстала ў Кнаразах прадукцыйная спулдзельня Вольга, якую ўсе называлі „Барышча” першая запісалася на члена. Са ўсёй сілы старалася сама выпрацаваць як найбольш днёвак, пасылала ўжо падросшых дзяцей да лёгкіх прац, як пасенне інвентара, пасылкі і г.д. Трэба сказаць, што ўсе дочкі былі вельмі працавітыя, прыгожыя, але бедныя, а бедных спулдзельня шанавала. Сталі яны разам з маткаю выпрацоўваць што раз больш трудадзён. Мелі яны надзвычай маленькую, пакрытаю саломай старэнькую хатку. Управа спулдзельні пастанавіла выбудаваць гэтай, да сіх пор беднай удаве, мураваную хату на месцы старой. Ужо шмат гадоў жыла яна ў новай хаце. Атрымала за сваю працу шмат збожжа і грошай. Прапала бяда. Забылі пра голад, які раней цярпелі.

Дзяўчынкі што раз лепш сталі ўбірацца. Хутка адна за другою сталі выходзіць замуж. Найстарэйшая Лідзія выйшла за Сяргея і жыве ў Беластоку. Муж яе не п’е гарэлкі. Добра зарабляе. Пабудаваў мураваны дом. Дзеці вучацца ў ліцэйскіх школах. Жывуць заможна і шчасліва. Другая дачка Гандзя таксама жыве ў Беластоку. Муж яе маляр-дэкаратар таксама добра зарабляе і маюць двое прыгожанькіх дзяцей, якія добра вучацца. Таксама жывуць добра. Трэцяя дачка Вольга выйшла замуж за электратэхніка. Добра зарабляе. Усе маюць радыё, тэлевізары, а сын Паўлік Федорук жыве з маткаю ў мураваным доме і са сваёй ужо жонкай мае трое дзяцей. Жыве Паўлік у вялікай дружбе з сёстрамі і іх мужамі. Памагаюць сабе ўзаемна. Паўлік дае ім сельскагаспадарчыя прадукты, як мяса, сыр, малако, яйкі, а з Бе-



Анна Федорук выйшла замуж за Міхала Кірылюка, сына Омэляна, абое былі з Кнаразоў, 1950-ыя гады



Люба Ніколаюк з Кнаразоў выйшла замуж за Івана Боўтручука з Войшкаў, 1950-ыя гады



Дзяўчыны з Кнаразоў: Люба Кірылюк, Ніна Філімонюк, Варвара Філімонюк, Люба Стэпанюк



Кнаразы, выезд да шлюбу, 1970 г.

ластока прысылаюць яму адзежу, грошы на падатак, сшыткі і кніжкі для дзяцей. А маці цяпер вельмі шчаслівая і жаданая госця ў кожнай дачкі ці зяця ды яшчэ больш патрэбная як нянька і апекунка ўнучак у вёсцы.

Але тут раптам вялікая перамена. Барышча пайшла злажыць сена ў капіцы на сенажаці. Нечакана падыйшла маланка і забіла яе на смерць. Гэта было пад вечар. Не дажддаліся маткі дома і пайшлі шукаць. Але ноч была цёмная, не найшлі. Толькі на другі дзень знайшлі яе. Абвесцілі ўсім аб смерці. Тут была праўдзівая трагедыя. Прыехалі ўсе тры дачкі са сваімі мужамі і ўсімі ўнукамі. Усе яны былі багата ўбраныя. Закупілі прыгожую труну. Была вельмі прыгожая пагода. Пахавалі яе вельмі ўрачыста на Плоскай Гары, каля свайго мужа Борыса.

Калісь тут быў іншы трагічны выпадак. Сын Паўлік забаўляўся на Вэлікіх Облогах артылерыйскім снарадам, пакінутым немцамі ў спошнюю вайну. Снарад разарваўся і асколкам раніла Паўліка, амаль у самае сэрца, але ў шпіталю ў Бельску вылечыўся.

Калі памёр мой добры сусед Борыс, які пакінуў жонку і чацвёра малых дзяцей, я па магчымасці апекаваўся гэтай сям'ёй. Адзін раз жонка Борыса папрасіла мяне, каб выкапаць яму на бульбу. Калі я выкапаў яму каля двух метраў глыбокую, то на дне знайшоў драўляную, з цесаных, не пілаваных, сасновых, смольных досак труну, але баяўся яе адкрываць. Гэта было ўначы, а апрача таго труна толькі да палавіны была ў яме, а другая палавіна была ў беразе ямы. Я пашкадаваў сваёй працы, бо Барышча не захацела бы сыпаць бульбу, крыху прысыпаў гроб пяском, прыдаптаў як водзіцца, зрабіў рыдлёўкай ў яме на дне крыжык. Нічога не сказаў ёй аб гэтым і бульба зімавала добра. Але хутка я выехаў з Кнаразоў і толькі пасля праз некалькі гадоў сказаў ёй аб гэтым. Цікава было б ведаць, што гэта за гроб, з якіх часоў? Бо ніхто ў Кнаразах не памятае, каб там, на тым узгорку, каля Тамашавага млына, былі калісь могілкі. Месца гэта на ўсход ад мліна на адлегласць 20-30 метраў. Калісь там ляжаў камень з невыразнымі літарамі.

Хілімон Федорук

Другі сын Нічыпара, які жыў вельмі бедна. Сам ён быў надзвычай працавіты. Цэлае жыццё малаціў цэпам збожжа і выконваў іншыя працы ў памешчыка Гэндзля і нібы то зарабляў, але адначасова не меў магчымасці даглядзець сваю гаспадарку. Жонка яго была з вёскі Трэшчоткі. Хваравітая, хутка і памерла. Хілімон яшчэ ў свабодныя дні шыў боты для сялян, рабіў хамуты. Але меў добрае сэрца, а людзі не часта лічылі патрэбным заплаціць за работу ў час і салідна. Але пражыў ён вельмі доўга, можа 90 гадоў.

Пасля бацькі гаспадарыць тут яго сын Уладзімір Федорук. Гаспадарка што раз лепш выглядзіць. Паставіў новую хату. Навучыўся кавальства. Пабудаваў кузню і жыве лепш, як жыў яго бацька. Ёсць тут яшчэ яго сястра, якая мела нешлюбную дачку Дусю. Дуся вельмі прыгожая, разумная, стройная і працавітая дзяўчына. Не мае яна шчасця і не выходзіць замуж, толькі таму, што яшчэ пануюць устарэлыя погляды і перасуды, што нібы нешлюбная дзяўчына мае меншую вартасць ад усіх іншых.

Кузьма Іванюк

Прызывалі яго Дэнісючком. Не запабеглівы быў гэта гаспадар. Любіў ён кожны дзень абегчы поў сяла. Любіў папляткаваць. Збіраў найнавейшыя ў сяле

навіны. Да работы не вельмі рваўся. Была ў яго жонка Софіяй звалі. Адзін раз яе застала ў полі моцная бура з маланкай. Ліў аграмадны дождж. Яна схавалася да пустой клуні. Ад сільнага подмуху ветру клуня развалілася і канцом бэлькі ўдарыла яе па галаве і забіла на смерць. Адначасова было тут больш людзей, але ўсе ўспелі выбегчы на двор. Быў тут і яе муж Кузьма. Гаспадарку трымала яго вельмі працавітая і запабеглівая жонка Софія і цётка Параска, якая была старой паннай. У Кузьмы было аж чатыры сястры: Ганна была за Ефрамам Туневіцкім ў Кожыне. Марыя за Хвэдосем Перэвоем, Кацярына за Андрэем Савіцкім і Тэкля за Васілюком у Кнаразах. Апошнія Марыя і Кацярына жывуць у Савецкім Саюзе. Да сваёй дачкі Ніны Кузьма прыняў зяця Феодара Ваўрэнюка. Ён ужо памёр. Гаспадарку вядзе Ніна з дзяцьмі.

Міхаіл Іванюк

Быў ён зяцем Половінчыка, прыйшоў ад Файса. Жонка Міхаіла была Марыся. Половінчык калісь служыў у царскім войску 25 гадоў. За гэты час ён зусім забыў родную беларускую мову і заўсёды гаварыў толькі на рускай мове. Большую частку жыцця ён правёў у арміі. Можа добра ўмеў ваенную муштру, але дрэнны быў з яго гаспадар. Не шмат лепшым быў і Міхась Іванюк. Але Міхась быў вельмі забаўны чалавек. Калі падап'е, а нават цвярозы калі яго папрасіць, то ўмеў шмат штучак, як скробат. Умеў ён кружыцца як калёсы ў возе. Доўга мог стаяць на галаве. Плёў добрыя кошыкі і шыў з саломы сівэнькі і кублі на муку ці збожжа. У яго сын Васіль Іванюк, а яго жонка Яўдося была вельмі прыгожая. Жыла тут сястра Яўдосі Матрона, якая нарадзіла хлопца, што і цяпер жыве з бацькам на гаспадарцы. Выходзіць, што Васіль меў адразу дзве жонкі – сястры. Свае дочкі Васіль павыдаваў адну да Плютыч, а дзве за братоў блізнюкоў – Мікалая і Уладзіміра Грыгорукоў з Зубава (Амерыканцы).

Тацьяна Артэмюк-Ільяшук

Жыла яна на калёніі. Падчас акупацыі немцы перасялілі яе да сяла. Доўгі час жыве яна як удава, але гаспадарку трымае не найгорш з сынам Уладзімірам Ільяшуком.

Аляксандр Сідарук, сын Аляксандра

Гэта праўдзівы тып добрага гаспадара. Пабудаваўся ён на сваёй калёніі блізка вёскі адразу пасля камасацыі зямлі. Паходзіць ён з радзіны, якую празываюць Балаксонамі. Жонка яго гэта дачка Тацьяны. Вельмі разумны, працавіты і добрасумленны гаспадар. Усё жыццё яму дапамагаў бацька Аляксандар і цётка Хвэдося, якія нядаўна толькі паўміралі. Цяпер на гаспадарцы дапамагаюць яму сыны. Адзін з іх Мікалай скончыў агульнаадукацыйны ліцэй ў Бельску. Аляксандр Аляксандравіч нядаўна памёр.

Ігар Нічыпарук

Жыве на другой палаці сяла, здалёк ад вёскі Кнаразы, ўбок вёскі Зубава. Гэта зяць Міхася Нікіцюка. Жонка яго ў маладым узросце аслепла на адно вока. Жыве тут сястра жонкі ці як кажуць швагерка, якая ад нараджэння нямова. Але ў маладосці была яна вельмі прыгожая дзяўчына. Дапамагае ў працы на гаспадарцы. Цэлая гаспадарка пастаўлена вельмі добра. Цяпер разам з бацькам гаспадарыць тут яго сын Іван Нічыпарук.

Васілько Леўчук

Жыў на калёніі каля Гэндзля, на цэлым участку зямлі, але быў вельмі не зарадны гаспадар, таму жыў вельмі бед-

на. Немцы перасялілі яго на калёнію Ігара Нічыпарука. Пад старасць стаў прычудлівым, заўсёды сватаўся да ўдавіц, але ні адна не хацела пайсці, бо меў можа 90 гадоў. Меў ён аднаго сына Мікалая, які працуе як трактарыст.

Васілько Кірылюк

Празываюць яго сышчыкам. Жыве на сваёй калёніі зусім блізка ад сяла. Жыў ёй доўга ў старой маленькай хатцы і толькі нядаўна пабудаваў новую. Часта ён б'е сваю жонку. У іх былі вельмі прыгожыя дочкі, якія хутка павыходзілі замуж. Сам Васіль доўгі час жыў у Расіі. Вельмі любіць ён выпіць кілішак водкі. Па прычыне ці без прычыны ён амаль кожны дзень у Бельску. Да апошняй амністыі сядзеў у турме ў Беластоку за якуюсь пакражу. Цяпер на гаспадарцы яго сын. Жонка доўга гаспадарыла без Васіля, а цяпер ён жыве ў новай хаце, а жонка ў старэнькай.

Іозоўко Вязоўскі

Празывалі яго Шундарам. Жыў калісці на Загор'і. Пасля перабудаваўся на самы канец вёскі ад Зубава. Быў гэта крэпкі, каранасты і нязмерна сільны чалавек. Насіў рыжаватую бараду. Жыў не багата. Пасля гаспадарыў яго сын Рыгор Вязоўскі, у яго было тры сястры: Волька, Матрона і Аксэнна. Аксэнна доўгі час была за служанку ў жыдоў у Беластоку. Пасля выйшла замуж да вёскі Трэшчоткі, але яе муж, які быў псыхічна хворы, яе сонную зарэзаў на смерць нажом. Волька і Матрона былі старымі паннамі і ўжо паўміралі. Памёр і сам Рыгор. Сына Рыгора Міхася хтось забіў у Свічкові і завалок у патарфовы роў і там падапхнуў пад лёд. У сувязі з тым арыштаваны браты Алёшка і Еўгені Крышпінюкі, але з браку доказаў суд апраўдаў іх. Цяпер тут гаспадарыць нешлюбны сын Аксэнны.

Скепка Лукаш

Жыве каля Вязоўскага. Сам ён паходзіць з вёскі Арэшкава, але быў жанаты ў Кнаразах. Яго тэсці не вярнуліся з бежанства падчас першай вайны і ён абняў усю гаспадарку. Цяпер на ёй памагае бацьку яго сын Аляксей Скепка. Гаспадарка пастаўлена добра.

Герасім Федарук – Каравай

Меў ён калісь найпрыгажэйшы сад. Коварат каля сада замыкаў нанач на ключ, каб ніхто не праехаў вуліцай. Сын Каравая Ігнат пасля першай вайны застаўся ў Маскве і няма ніякіх аб ім звестак. На гаспадарцы быў Нічыпар Федарук. У яго было две дачкі. Да адной ён прыняў зяця Якіма Стэпанюка, які і цяпер яшчэ жыве, мае амаль 80 гадоў. Сівы як голуб. Сваю дочку Якім і яго жонка Наташа аддалі за Васільковага сына. Якім нядаўна памёр.

Аляксей Клімюк

Празывалі яго чабанам. Пасля першай вайны ніхто з бежанства не вярнуўся. Яго гаспадарку разабралі сваякі: Трофім, Еўгеній і Кондрат Крышпінюкі. Пасяліўся тут Трофім Крышпінюк, якога празываюць варшавякам, бо ён доўгі час жыў у Варшаве. Две першыя жонкі былі таксама з Варшавы, а трэцяя Хрыстына з Кнаразоў. Яго адзін сын ажаніўся і жыве вельмі добра ў Беластоку, а другі жыве на гаспадарцы, але недаразвіты.

Наўм Іванюк

Празывалі яго файсам. У Наўма было шмат братоў. Пайшлі яны ў прыступы: адзін да вёскі Гусакі, Міхал да Палавінчыка, Даніла да Лукаша – Баглея, Андрэй жыў дзесь у горадзе, а Аляксей застаўся на гаспадарцы. У Наўма таксама было шмат сыноў: Пятро, Якім, Аляксей, Хвэдось, Андрэй і Нестар. Хвэдось выбраўся да Бель-



ска, Нестар аддзяліўся, Андрэй пайшоў у прыступы да вёскі Козлікі, а Пятро і Якім паўміралі кавалерамі. Цяпер на гаспадарцы Аляксей Іванюк, каменяцёс.

Андрэй Вязоўскі

Быў ён старым кавалерам, вельмі прыгожы і багаты чалавек. Надта дбаў пра сваю гаспадарку і не меў часу ажаніцца. Але як шэйгалі меў дзяцей не мала. Быў тут яшчэ хвараваты і таксама стары кавалер Тыхонь. Перад смерцю Вязоўскі зажадаў, каб сын Аляксея Іванюка ажаніўся на яго сваячцы і запісаў яму цэлы маёнтак, бо нікога з блізкіх родных не было. На гэтым месцы пастаўлена новая прыгожая хата, ў якой жыве сын Аляксея Ўладзімір Іванюк са сваёй жонкай. Калісь нябожчык Наўм часта меў прыказку "Як хто што ўкрадне, а схова ладне, то як з неба ўпадне". Не маральная гэта была прыказка, не мела яна фактарам добрага выхавання і не прынясла яна сям'і вялікіх карысці. Сыны Пятро і Якім невядома дзе падзеліся, а Андрэй у Козліках жыве з дзяцінньімі манерамі.

Лярко Оніщчук

Меў ён 5 дочак і 2 сыноў. Старэйшага сына Рыгора ён часта збіваў да паўсмерці. Пад канец Рыгор і зусім здурэў і хутка памёр. Пасля смерці бацькі гаспадарыў малодшы сын Моісей. Асталася пасля яго адна дачка, да якой прыступіў Савіцкі з вёскі Катлы. Калісь Лярко лічыўся найлепшым майстрам. Вырабляў ён драўляныя сахі і ярма. У саху запрагалі пару валоў ці карову і гэтак аралі зямлю. Цяпер цяжка знайсці саху ці ярмо нават на паказ. Цяжкая праца была гэтаю сахою. Трэбы было моцна трымаць у руках. Не кожны меў да гэтага сілу і спрыт. Дрэнная была апрацоўка зямлі і дрэнныя ўраджаі людзі тады збіралі са сваіх вузкіх палоскаў зямлі ў шахаўніцы. Не ведалі тады і штучных угнаенняў. Не было зусім сэрадэлі, лубіну, цукровых буракоў. Ведзьмы кралі малако ад кароў. Парасята часта здыхалі таму, што нібы хтось паглядзеў шкадлівым вокам. Лярка на Ліяша вязаў пшаніцу, а ноччу хтось панасіў усе снапы ў глыбокую яму з вадою. Цяпер называюць "Ляркова яма" ў Плоскум.

Дэмід Капітанюк-Гарэцкі

Яго прозвішча было падвойнае. Працавіты быў гэта чалавек, багаты, але цэлае жыццё, і зімою, і летам на галаве насіў цёплую скураную шапку. Трымаў доўгія валасы, пастрыжаныя пад скобку. Першая яго жонка рана памерла. Другой жонкай была вельмі прыгожая, высокага росту Кацярына ад Клемента Крышпінюка. У Дэміда было тры сыны: Трохім, Онуфрый і Корніло ды дачка Вольга, якая была старой паннай. Доўгі час вёў гаспадарку Корніло Капітанюк. Усе ўжо паўміралі. Цяпер вядзе гаспадарку Рыгор Капітанюк, сын Корніла. Яго жонка з Беразова. Цэлая сям'я Дэміда, пасля Корніла, а цяпер Рыгора вельмі дружная і працавітая. Корніло першы ў сяле паставіў найпрыгажэйшую, новую хату з ганкам і некалькімі пакоямі, накрытую гонтамі. Цэлая гаспадарка і цяпер вельмі добра пастаўлена. Жывуць багата. Ёсць прыгожы сад.

Даніла Іванюк-Самчук

Паходзіць з радзіны Файсаў. Даніла быў прыступа. Нічым асаблівым ён не адрозніваўся. Быў чалавекам цікім, спакойным. Яго сын Омелян Іванюк меў жонку з вёскі Дэніскі. Не ўмеў ён добра выхаваць дзяцей. Цяпер ён гаспадарыць разам з сынам, але лёс яго на старасці жыцця вельмі дрэнны. Даходзіць да скаргаў і распраў у судзе.



Андрэй Крышпінюк

Гэта сын Клемента. У яго быў прыгожы сад. Сям'я малая. Пасля бежанства ў час першай вайны ніхто не вярнуўся і гаспадарку раздзялілі паміж сабою яго сваякі. Быў у Андрэя родны брат Кондрат, які працаваў гарадавым. У Маскве ў таямнічы спосаб ён памёр на кватэры ў яго нарачонай. Быў ён кавалерам ва ўзросце каля 30 гадоў. Доўга труп ляжаў зімою на гарышчы пэўнага дома. Суда не было. Пахаваны ў Маскве. На яго пахаванні быў Трахім Крышпінюк. Я таксама бачыў яго нежывога.

Арцем Крышпінюк

Меў ён аж 4 сыноў. Найстарэйшы Мірон доўга быў за парубка ў пані Дамброўскай. Другі сын Арцем жыў у Варшаве. Трэці Давыд падчас акупацыі выехаў з Варшавы да Чэрнігава і адтуль не вярнуўся. Чацвёрты Трахім жыў то ў Варшаве, то ў Кнаразах, то зноў у Варшаве. Доўгі час тут гаспадарыў Мірон Крышпінюк. Цяпер тут жыве сын Мірона Еўгеній Крышпінюк. Жонка яго адАнуфрыя Перэвоя, бяздзетная. Была ў Мірона сястра Уляна, якая цэлае жыццё працавала як батрачка ў Дамброўскай. Сам я бачыў як Дамброўская біла Уляну па твару мокрай шматай за тое, што карова падчас даення абганялася ад мух і брудную нагу ўсадзіла ў шкопак з малаком. Горка плакала Уляна. Пасля гэтага ў мяне паўстала да паноў пагарда. Цяжкае было жыццё Уляны пад старасць. Усе аб гэтым добра ведаюць.

Калісь Мірон паставіў новую хату, так як і ўсе ў шэраг ад вуліцы. Яго сусед Саўка запратэставаў, што нібы не было адлегласці ад яго хаты. А жылі яны не ў згодзе з Міронам. Усе вельмі шкадавалі Мірона, бо ён быў вельмі добры чалавек. Суд прысудзіў зняць хату. Але Мірон не разбіраў хаты, а папрасіў людзей бадай з поў сяла. Усе грамадой узяліся дружна. Падлажылі пад падваліны круглыя адрэзкі дрэва і перацягнулі гэту хату на агарод, на адлегласць. Калі цягнулі гэту хату, то вельмі яна скрыпела і гэтым самым наводзіла пэўны сум, не толькі на ўсіх людзей, але нават на самага Саўку, які, як кажуць гарэў са ўстыду. Хутка пасыпаліся на Саўку розныя няшчасці і цяпер на гэтым месцы нікога не засталося. Усе казалі, што гэта Бог адпомсціў за нелюдскія адносіны да суседа, бо ў вёсцы шмат было надта вузкіх падворкаў і калі б прыйшлося адсоўваць на адлегласць, то амаль палавіна вёскі мусіла б перацягаць свае хаты на новыя месцы.

Арцем Іванюк

Выехаў у 1945 годзе ў Расію. Яго хату, хлявы, агарод і сад купіў Лярко Крышпінюк, які цяпер тут гаспадарыць. Паставіў Лярко новую хату, а старая і цяпер яшчэ тут стаіць. Ёсць яна як бы сведкам даўняга мінулага. Быў тут добры сад, а Лярко яшчэ больш яго пашырыў. Умовы гаспадарання тут добрыя. Шмат сенакосаў. Абшырнае торфавіска. Добрая зямля, толькі не хапае ініцыятывы, як з боку мужчын, так больш з боку гаспадыні.

Антон Паўлючук

Быў сынам аднаго з найбагацейшых гаспадароў. Меў ён драўляны млын – вятрак. Быў ён нібы набожны. Часта хадзіў у царкву, маліўся і хрысціўся, як бы напаказ. Але калі надарылася аказыя, то шмат снапоў пшаніцы ўкраў у спулдзельні прадукцыйнай з поля. Злавілі яго, як кажуць, на гарачым учынку. Антон ужо памёр. На гэтым месцы жыве яго сын.

Мікалай Паўлючук

Быў сынам Тамаша, якога prазывалі Смужам. Славіўся сваім багаццем на ўсю



Анна, дачка Панаса Красоўскага з мужам Аляксеем Філімонюком, каля 1938 г.



Пэрэзва на вяселлі Яўгена Кірылюка, Кнаразы, 1980 г.



вёску. Жонка Міколая Прузына была вельмі калісь прыгожая і дабрадушная, з вёскі Агароднікі. Яе слабасць выкарыстала яе нявестка, а жонка Івана. Узаемаадносіны былі вельмі дрэнныя. Пасля смерці Міколая цяжкі лёс яе спаткаў на старасць. Ужо яна памерла. Цяпер гаспадарку вядзе сын Іван Паўлючук. Гаспадарка пастаўлена добра. Зусім новыя і абшырныя ўсе будоўлі. Добры сад. Вядуцца тут пчолы.

Матхвей Паўлючук

Быў ён сынам Тамаша. Не рваўся да работы ў гаспадарцы. Часта шпацыраваў з парасолькай. Да навукі быў не здольны. Жанаты з той Елізаветай, якая засталася ўдавой пасля забітага на вайне Івана. Была тут адна толькі дачка, якая хутка памерла ад чахоткі. Пасля смерці Матхвея сюды прыступіў Дэніс Томашук, які ўжо памёр. Калісь прыгожая Елізавета ўжо не мае намеру выходзіць замуж у чацверты раз. Цяпер гаспадарыць сын Грыгоры Томашук.

Пархвен Семянюк

Жыў каля Томаша. Меў ён шмат сыноў, але не ведаю чаму гаспадарка была вельмі мізэрная. Прыпамінаю сабе, ці то праўду, ці анекдоту, што ў аднаго гаспадара здохла тлустая свіння. Выцягнулі яе на ўзгорак у яму. Пархвенча ўзяла нож і паадрэзвала куньпы. Хтось падгледзіў і была шырокая тэма для размовы ў вёсцы. Мала лепш ішла гаспадарка, калі жыў Павел Семянюк. Можа гэта было, як кажуць, нешчаслівае месца, бо яго сын Мікалай Семянюк пабудаваў усе новыя будынкі і на новым месцы. На поўучастку трымае часам больш за 20 штук свінней і жыве лепш як жыў яго бацька і дзед.

Калісь сын Пархвена Віктар гуляў на санках на лёдзе пры круцёлцы, там дзе цяпер стаіць хата Кондрата Крышпінюка. Санкі так падбілі Віктара, што яго зусім нежывога прыняслі дахаты. Але тут сталі яго ў плахце гойдаць і ажыў. Сам я гэта бачыў. Другі сын Пархвена Лукаш доўгі час жыў у Варшаве. Пасля пераехаў у Чэрнігаў і там памёр. Цяпер на гэтым месцы стаіць хата Зенькі Красоўскай.

Ядамэць Яконюк

Жыў каля Пархвена. Быў гэта зусім непісьменны чалавек. Насіў вялікую чорную бараду. Ён быў не ўчоны, але прыродны розум меў надзвычай добры. Можа цяжкае жыццё вырабіла ў ім штуку мыслення. Ён доўгі час быў солтысам. Першы пачаў арганізаваць асушку тарфовага балота. Пад старасць быў ён падслепаваты, але пры дапамозе вучня III класа тутэйшай школы змог вывесці простую лінію на граніцы ад вёскі Плескі. Сам першы стаў капаць роў і за яго прыкладам пайшла цэлая вёска. Выкапаны роў даўжынёю каля 2 вёрст. Вада ўцякла да ракі Арлянкі, а пасля да ракі Нарві. Балота стала даваць больш карысці. Сталі капаць торф на распалку. З часам заара́лі тарфавіска і засеялі розныя травы. Знікла вялікая купіна. Паверхня выраўнялася. Ніхто не пазнаў бы гэтага балота. Ніхто з гэтай сям'і не вярнуўся з бежанства. На гэтым месцы стаіць хата Зенькі Красоўскай.

Зенька Красоўска

Жыве яна цяпер зусім сама, мае 79 гадоў. Муж яе ў маладым ўзросце памёр. Сын забіты ў вёсцы Плескі падчас святкавання "Спаса" – 6 августа па старым стылю. Трэба адзначыць, што плёскаўская праваслаўная парафія штогод урачыста адзначае гэтае свята. Не абыходзіцца тут аднак без падобных выпадкаў амаль кожны год. Ёсць тут царква. Пастаянна жыве свяшчэннік. Каля царквы знаходзіцца сямікласная школа і некалькі



настаўнікаў. Здаецца не павінна быць такога хуліганства.

Павел Красоўскі

Ён даволі развіты чалавек. Мае ён вялікі лякарскі падручнік, які абапіраецца на лякарствах зёламі. Як гаспадар ён неважны. Часта любіць піць гарэлку. Яго заслугай можна лічыць тое, што па яго ініцыятыве абгароджаны могілкі на Плоскай Гары. Збудаваў ён уласнаручна млынок-вятрак, у якім малоў збожжа, але вецер раздмухаў яго. Тут яшчэ жыве Іван Дудзін. Каля хаты прыгожы сад.

Карп Філіманюк, сын Кондрата

Калісь ён жыў у старой Овтуховай хатцы. Пасля пабудаваўся на пляцу, дзе калісь жыла Гароднічка Перэвой і Аўсені Перэвой, бацька Іваніска. Карп быў вельмі добрым гаспадаром. Да ўсякай працы яго рукі прысталі. Меў ён добрую кузню. Завёў ён добры сад. Пабудаваў усе новыя будынкі. Трымаў пчолы. Рана памёр. Цяпер на гэтай гаспадарцы яго сын Аляксей Хіліманюк.

Конан Герасімюк

Быў сынам Васіля – Зайцам празывалі. Конанаў дзед Якім і мой дзед Міхась былі родныя браты. Адсюль выходзіць мая маці. Конан выбраўся на калёнію пад Суботку, а мой бацька, як прыступа з Агароднік перабраўся на самы канец вёскі ўбок Зубава. Дрэнны гаспадар быў Конан. Цяпер на гаспадарцы пад вульшынаю гаспадарыць яго сын Васіль Герасімюк. Зусім іначай пастаўлена гаспадарка. Але Конан з сынам не паладзілі і жывуць раздзельна.

Максім Іванюк, сын Максіма

Жыве на тым самым месцы, дзе калісь жыў дзед Томаш – прасучкамі празывалі. Яго мураваная хата стаіць там, дзе калісь стаяла хата майго бацькі Нестара Перэвоя. У гэтай старэнькай драўлянай хаце і я нарадзіўся. Максім любіць гарэлку. Без перапынку курыць папіросы, часам на пазычаныя грошы. Моцна і без перапынку кашляе і за каждым словам, там дзе трэба і дзе не трэба ўжывае мацерных слоў. Няма тут культуры ў цэлай, хаця і новай муразанай хаце. Дрэнны прыклад дае бацька. Была тут калісь цётка Хімка – старая панна. Яна была так ашчадна, што адны чаравікі, як сама казала, насіла 19 гадоў. Надзявала іх толькі, як ішла да царквы і то найчасцей насіла іх летам у хустцы. Сям'я тут вялікая, але гаспадарка магла бы выглядаць іначай.

Сцяпан Хоманюк, сын Арцёма

Бацька, дзед і прадзед жылі вельмі бедна. Дзед называўся Пятро, сын Пятро і ўнук Пятро. Па суседству жыла каваліха Малка, якая часта паўтарала, што ў суседзяў ёсць Пятро, Пэтрык і Петрачка. Сцяпан быў разумны гаспадар. Вельмі запабеглівы і працавіты. Але нешчаслівы лёс спаткаў яго ў самым розквіце жыцця. Павёз ён да Дамброўскага на сьрутоўнік малоць збожжа. Тут не ведама з якой прычыны разляцеўся жорнавы камень і так асколак ударыў яго ў галаву, што адразу труп на месцы. Засталася жонка і трое дзяцей. Доўга яны гаравалі. Але калі падрос і ўзяўся за гаспадарку яго сын Янка Хоманюк, то гаспадарка пайшла вельмі добра. Пабудавана прыгожая, сучасная хата з вялікімі вокнамі. Пабудаваны цэлы доўгі шэраг хлявоў, у якіх поўна хатняй жывіны, як каровы, свінні, авечкі. Калі б усе нябожчыкі паўставалі, то не пазналі бы таго месца, дзе яны так марна пражылі.

Кондрат Крышпінюк

Сын Васілюшкі. Прыступа да Прусачковай Ганны. Працавіты гэта чалавек.

Не менш працавітая і яго жонка Ганна. Толькі Ганна праз усё жыццё старалася дзяржаць рэй над цэлым домам, а свайго мужа спіхала да ролі працавітага парубка. Была яна не пісьменная і не магла даць добрага выхавання сваім дзецям. Дрэннае было жыццё Кондрата. Хату ён купіў гатовую, але мусіў паставіць яе на тым лузе ў даліне, дзе калісь была коўзанка і дзе забіўся на круцёлцы Віктар Семянюк. Шмат узгорка трэба было перавезці, пяску, каб выраўняць пляц пад дом. Падчас камасацыі ўсе будынкі перавозіў на калёнію аж пад Беляноўшчыну. Падчас акупацыі немцы зноў перасялілі на старое месца і так кругом. Яго тэсць Піліп быў вельмі добрым чалавекам. Кондрат любіць расказваць розныя небыліцы, часта на нахабныя тэмы. За кожным словам ужывае мацерных слоў. Цяпер разам з бацькам гаспадарыць яго сын Еўгені Крышпінюк.

Аляксей Ніколаюк

Хатка яго стаіць паміж хатай Кондрата і хатай Алёшкі Федорука. Аляксей са сваёй жонкай Марынай жылі спачатку ў сяле, пасля выбраліся на калёнію аж пад Пэрэдлазніско, на так званыя Вэлікі Облогі. Падчас акупацыі немцы зноў перасялілі на старое месца да вёскі. Нейкі час жылі яны ў дачкі ў Бельску, а цяпер тут зноў жывуць. Няма тут іншых будынкаў толькі адна старэнькая, саломай крытая хатка. Дрэнны гаспадар Ніколаюк. Надта многа выпівае водкі. Не любіць працы. Часта б'е сваю жонку, якая нашмат разумнейшая за яго. Працавітая яна, але надакучыла ёй працаваць на гарэлку для мужа. Часам Аляксей прадае на рынку ў Бельску рыжовыя венікі да замятання хатаў. Нядаўна Аляксей памёр.

Алёша Федорук

Завуць яго Дамісін, а гэта таму, што Даміся рана асталася ўдавой і цяжкай працай падтрымлівала гаспадарку. Яшчэ і цяпер жыве Даміся. Не можа яна нарадавацца сваім жыццём. Добра жыве яна са сваёй нявесткай. Цяпер Даміся жыве ў унучкі Марысі ў Бельску. Марыся закончыла Эканамічны ліцэй і мае добру пасаду. Даміся пільнуе сваю праўнучку. Алёша разам з сынам Васілём вельмі добра вядуць гаспадарку. З такой працы і такой гаспадаркі павінны браць прыклад ўсе сяляне. Алёша першы правёў электрычнасць. Паставіў матор, які гоніць малацілку, сячкарню, сьрутоўнік ці веялку. Трымае ён пару добрых каней, якія цягнуць плуг, касілку, сеўнік ці жняярку. Мае 4 добрых кароў і некалькі ялоўняка. Шмат мае свіней. Шмат кантрактуе грэчкі і іншых раслін. Вельмі чыста і культурна тут у хаце. Працавітая і дружная гэтая цэлая сям'я.

Школа падставова

Будынак пабудавалі ў 1897-98 гадах. Калісь на гэтым месцы стаяў магазін збажжовы цэлай вёскі Кнаразы. Сюды сяляне зсыпалі пад прымусам добра высушанае ў пячы жыта на выпадак галадоўкі. Кожны год бяднейшыя сяляне пазычалі тут жыта. Малолі ў жорнах на хлеб і так дацягалі да новага ўраджаю. Ураджаі былі вельмі слабыя. Сяляне малацілі цэпамі збожжа. Аддавалі доўг да магазіну і зноў мала аставалася на ўтрыманне і харчаванне цэлай сям'і на цэлы год. Вакол магазіна былі пакопаны глыбокія ямы. Тут людзі бралі гліну на падлогі да хатаў, на печы, на клепіска да клуні. У школе былі драўляныя падлогі і з таго часу людзі сталі закідаць звычай убіваць падлогу з гліны. Каля школы вельмі прыгожы сад, які я садзіў разам з настаўнікам Сяргеем Монаховічам з Пасынкаў. Калісь у гэтым месцы нібы нешта страшыла людзей. Цяпер не толькі



не страшыць, але як магнітам школа прыцягвае людзей да сваіх пакояў. Людзі сталі жыць лепш і культурней.

Сафрон Артэмюк

Быў сынам Даніла, Памошкам празывалі. Не ведаю якая прычына, ці таму што жыве блізка школы, ці таму, што цэлая вялікая сям'я Даніла жыла бедна, але дружна і з малых гадоў цяжка працавала і на сябе і на людзей. Ці можа таму, што старэйшыя браты былі ўжо добра пісьменныя, наймалодшы Сафрон як бы ад роду быў надзвычай разумны і чулы на чужое гора чалавек. Гаспадарку сваю вядзе пасрэдна. Але цэлае жыццё яго першай працай была праца для людзей. Доўгі час ён быў солтысам. Нейкі час старшынёй спулдзельні прадукцыйнай, старшынёй Г.Р.Н. у Храбалах. Дзве дачкі яго маюць сярэднюю адукацыю. Марыся больш як 10 гадоў працуе настаўніцай у Бельску. Малодшая, скалечаная крыху гайне-медынай, яшчэ вучыцца і цяпер. Сафрон быў першым папулярызатарам электрыфікацыі вёскі Кнаразы, Зубава і іншых. Цяпер ён больш жыве сам адзін і не можа праяўляць большай ініцыятывы.

Онуфры Перэвой

Бацька яго быў прыступа з вёскі Агароднікі. Рана памёр. Заставіў жонку Хімку і трох сыноў: Онуфрыя, Клемента і Міня. Два апошнія загінулі падчас першай вайны. Застаўся Онуфры. Да ўдавы Хімкі прыступіў Якубочко Яконюк. Бацькі паўміралі. Сын Дарафей пайшоў у прыступы да вёскі Катлы і цяпер там жыве. У Онуфрыя быў толькі адзін сын, які загінуў у войску, але ўжо пасля вайны. Онуфры гаспадарыў сам адзін. Пасля ён прыняў зяця Васіля Барысюка, які цяпер гаспадарыць. Жыў ён раней там, дзе цяпер жыве Алёша Хілімонюк. Празывалі Онуфрыя рыжым. Як гаспадар нічым не адрозніваўся ад іншых. Хаця сам быў надта безкультурным чалавекам, з кожнага любіў панасміхацца. Быў вялікі плёткар. Часта лгаў, хаця гэта яму не вельмі ўдавалася. Адну дачку ён аддаў да вёскі Мякішы, другая бяздзетная замужам за Еўгеніем Крышпінюком. Барысюк што раз лепш рэмантуе гаспадарку і ёсць надзея, што давядзе да лепшага стану.

Купрыян Ніколаюк

Cerkiew Mikołajewska z 1683 r., spłonęła 23 czerwca 1941 r.; reprodukcja ze zbiorów D. Fionika

ka 1939 roku. Wychowawczynią Ernesta jest Żydówka, która uczy rosyjskiego, matematyki i historii Sowieckiego Sojuza. Po Bożym Narodzeniu uczy się w szkole za torami. Wigilię spędza u dziadka, na którą wprosiła się zamieszkująca za ścianą rodzina komendanta sowieckiego.

Jest rok 1940. Mrozy, aż płoty pękają. Białka skuta lodem. W szkole zimno jak w psiarni. Dzieci siedzą w paltach. W poprzedniej szkole uczono rosyjskiego, w tej pani Dobkowska, żona posła na Sejm uczy białoruskiego.

- Pogoda jest dżdżysta. Wiosna przyszła wcześnie. Niedawno zdechł nasz pies Pilek. Po wyjeździe ojca na front pies przestał jeść, tylko pił wodę. Poprzednia moja szkoła przy ulicy Zamkowej jest wojskowymi koszarami. Przechodzę koło cerkwi. Chcę wejść do środka – zamknięte. Patrzę na obraz Matki Boskiej w złotej oprawie, który jest nad drzwiami. Matka Boska patrzy na mnie, oczy ma smutne. Zaczynam się modlić. Zmówiłem jeden pacierz, drugi, trzeci.

Do szkoły nie poszedł, bo było już późno. Odwiedza dziadków i Muzę, która rży w cieniu. Było to jego ostatnie spotkanie z kochanym koniem dziadkowym. Błąkając się po ulicach miasta, mija kuźnię Iwaniuka, który podkuwał konie. Na ulicy Kazimierzowskiej odwiedza szewca Szmulkę, który podzelował mu buty i nabił fleki. Za robotę nie chciał ani grosza.

- Tak włóczyłem się do wieczora. Ja, mama, siostry Janka i Zula oraz starszy brat Józef długi siedzieliśmy przy kolacji w komplecie – ale bez ojca. Wspominamy przygody w szkole, wycieczki z tatą za miasto i nad rzekę. Była to ostatnia wieczerza w tym

domu. Idziemy późno spać.

O godzinie 1.00 w nocy zostają obudzeni, każą się ubierać i zabrać najpotrzebniejsze rzeczy. Wszystko pakują na podstawioną już furmankę i pod konwojem jadą na stację, gdzie stoją dziesiątki furmanek, na których całe rodziny z tobołkami, z pościelą. Pakują wszystkich do wagonów towarowych. Tutaj spotykają dużo znajomych – Hipolita Wierzbowskiego, Zosię Sieleską, Żarskich i Dawidziaków, Stefana Majewskiego, Żyda Rubinstejna z żoną i synami. Cała rodzina Guzowskich wraz z babcią i dziadkiem – Stalewscy, prawie po trzech tygodniach, w ciężkich warunkach, często bez gorącej strawy, przez Kazań, Swierdłowsk, Pietropawłowsk, docierają do stacji Smirnowo, skąd samochodem jadą do wsi Borki.

Jeszcze do dzisiaj, Ernest Guzowski pamięta, jak przekraczali Ural. Skończyły się monotonne równiny, widoki są przepiękne. Na zboczach gór widać strzeliste świerki. Inny zupełnie kraj jak Polska. Ale co ich czeka, jeszcze nie wiedzą.

- W Borkach przyjęto nas dość życzliwie. Zostaliśmy ulokowani w jednej ze starych chat. Już drugiego dnia wszyscy idziemy do pracy. Tylko mała Zula zostaje w domu. Ja pracuję przy oczyszczaniu lemieszy przy pługach, które ciągnięte traktorami kroją płaty ziemi. Po kilku godzinach pracy całe dłonie w bąblach.

Polskie dzieci szybko nawiązały przyjaźń z małymi Kazachami. Razem spędzają wolny czas, razem łapią na stepie suśliki, z których ściągnięte skórki sprzedają na skupie. Wspólnie łapią nad jeziorem młode kaczki i pieką w ognisku.

- Mama w tym czasie była dojarką w kołchozie. Ja często uczestniczę w mieszaniu nogami łajna krowiego, z którego potem robi się tzw. kiziaki (cegły gówniane) do palenia w piecu. W domu się nie przelewa, często brakuje chleba, gdy nie możemy wykonać norm w pracy. Ale usłużni sąsiedzi pomagają nam jak mogą. Sąsiadka często przynosi nam mleko od własnej krowy. Jeszcze do dzisiaj pamiętam, że tak już nigdy nie smakowała nam pajda czarnego chleba własnego wypieku z ciepłym krowim miodem. Zrobiono ze mnie wodowoza. Z jeziora przywoziłem wodę w beczce do budowy obór. Beczkę z wodą ciągną stare woły. Muszę wykonać dzienną normę – 400 wiader.

Wkrótce przenoszą ich do Bejniethoru. Znów muszą przeprowadzać remont i wykonać kilka mebli do przydzielonego im mieszkania. W Bejniethorze mieszkają również Dawidziakowie, Bańkowscy, Piotrowska z synem Januszem z Knoryd. Tutaj przebywali Kwiatkowscy, siostry Wisłockie – Regina i Celina, Dobkowscy z córkami i wielu innych. Wszyscy pracowali w kołchozie, z trudem przetrzymując zimę. Śnieg zasypał całą wieś aż pod dachy, buran – śnieżne zamiecie – świata nie widać. Za to wiosna przychodziła szybko. Step zakwitał setkami kolorowych krokusów.

- Mój brat Józek odchodzi do wojska polskiego i z armią Andersa walczy na Zachodzie. Nigdy go już nie zobaczyłem. Po powrocie do kraju dowiedziałem się, że zginął pod Monte Cassino.

W Bejniethorze Ernest jest zatrudniony na pastucha. Pomaga naprawiać płoty i dachy, kopać sąsiadom ogródki i sadzić drzewa, za co otrzymuje kaszę jęczmienną, ziemniaki i mleko. Mama przywiozła z Bielska maszynę, więc często szyje dla Kazachów spodnie, sukienki, w zamian przynosi do domu różne artykuły spożywcze. Zarabia również po kilka rubli za wykonaną normę w cegielni. Kazachowie to naród w części prawosławny. Jeśli się modlili to po kryjomu, w domu. Cerkwie wykorzystywane były na magazyny i szkoły.

- 2 stycznia 1945 roku otrzymujemy od przedstawiciela Polskiego Komitetu



Wnętrze domu Kazachów

Ценное 500 руб.

Куда: Северо-Казахстанская область, Советский р-н, ст. Смирново, п/о Астраханка, Советское лесничество

Кому: ГУЗОВСКОЙ Болесла[illegible]

От кого: Представительство Польского Комитета Национального Освобождения в СССР – Москва, Спиридоньевская, 30.

пп.	Наименование	колич.	Сумма
1.	Пропуск на въезд в Польшу за № 8497 на имя ГУЗОВСКОЙ Болеславы от 14.XII-[illegible]	1	100 ру..
2.	Тоже за № 8498 на имя ГУЗОВСКОЙ Янины от 14.XII-	1	100 руб.
3.	Тоже за № 8499 на имя ГУЗОВСКОГО Иосифа –"–	1	100 руб.
4.	Тоже за № 8500 на имя ГУЗОВСКОГО Эрнеста –"– ✓	1	100 руб.
5.	Тоже за № 8501 на имя ГУЗОВС[illegible] –"–	1	100 руб.
		5	500 руб.

Зав. Общей Канц[illegible]
Представительства Польск[illegible]
[illegible] Освобожде[illegible]

[illegible] / ЛЯСМАН /

Dokument wydany przez PKWN, umożliwiający rodzinie Guzowskich powrót do kraju.

Wyzwolenia Narodowego przepustki na wyjazd do Polski. Taką samą przepustkę otrzymują ciocia Augustyniakowa i dziadek z babcią. Przepustki załatwiła w Polsce siostra mamy Helena Stalewska przez Polski Komitet Wyzwolenia Narodowego w Lublinie.

Za apaszkę mamy, dwa wiadra kartofli i spodnie ojca szybko przyjeżdżają do Polski. 15 stycznia 1945 roku opuszczają Astrachań, gdzie ostatnio mieszkali. Z żalem i płaczem żegnają Polaków miejscowi mieszkańcy, z którymi tak mocno się zżyli, że uważali ich za „swoich".

- O 5.30, 2 lutego 1945 roku dojeżdżamy do Bielska. Cała ulica Mickiewicza aż do samej cerkwi to tylko gruzy. Tam, gdzie stała moja szkoła na rogu Zamkowej i Księcia Józefa Poniatowskiego, pusty plac. Cerkwi, przed którą mówiłem pacierze do Matki Boskiej też nie ma. Całe centrum miasta – jedna ruina. Z wielką radością wita nas siostra mamy – Halina Stalewska. Tak zaczął się następny etap naszego życia.

Wiesław Falkowski


Ernest Guzowski

Ernest Guzowski urodził się 21 lutego 1927 r. w Bielsku Podlaskim. Syn Michała Guzowskiego, pracownika policji i Bolesławy ze Stalewskich. Przed 1939 r. ukończył pięć klas Szkoły Powszechnej, usytuowanej przy ul. ks. Józefa Poniatowskiego, róg Zamkowej. Jej kierownikiem był Tadeusz Jaroński. Wraz z rodzicami, siostrami Janiną i Zuzanną oraz bratem Józefem mieszkał przy ul. Batorego, która ciągnęła się od mostu za Białą aż do szosy hajnowskiej. 13 kwietnia 1940 r. dziadka, babcię i mamę Ernesta z czwórką dzieci oraz ciotkę Marię Augustyniak z dwójką dzieci wywieziono do Kazachstanu. Tam wszyscy przebywali do lutego 1945 r. Z wyjątkiem brata Józefa, który zginął pod Monte Cassino, wrócili szczęśliwie do Polski.

Po wojnie Ernest Guzowski ukończył Liceum Ogólnokształcące i pracował w różnych przedsiębiorstwach w Białymstoku, m.in. w Przedsiębiorstwie Budownictwa Miejskiego. Gdy przeszedł na emeryturę opisał swoje najmłodsze lata w książce „Wspomnienia z Północnego Kazachstanu – 1940-1945". Znajdziemy tu barwny opis życia bielszczan w okresie międzywojennym oraz opowieść o kilkuletnim pobycie prawie całego rodu Stalewskich poza granicami kraju.

Ernest Guzowski zmarł 31 grudnia 2002 r. i został pochowany na jednym z cmentarzy w Białymstoku.

КАМЕНІЕЧЧЫНА

Царква ў маёнтку Баршчэво

Дата заснавання сяла Баршчэва невядомая. А паколькі невядомая, дык гадаць няма патрэбы. З пісьмовых крыніц знаем, што тутэйшая царква св. Ануфрыя пабудавана была Сапегамі і імі жа ў 1686 г. надзелена зямельным фундушам. Гэтая дата дакладная. Значыць сяло паявілася раней. Паколькі гэта быў час вуніі, дык і царква была вуніяцкай, прыхадской.

Як забяспечваліся свяшчэннікі? У XVII ст., а паводле запісяў ўжо ў XV і XVI ст. свяшчэннікаў карміла зямля. Як вялікія былі надзелы, цяжка дакладна сказаць – яны абмерваліся валокамі, моргамі, прутамі, пруцікамі. Лепшыя надзелы складаліся з 2-3 валок (валока – 21 га). Большасць цэркваў мела 1-2 валокі. Разам з зямлёю прыпісваліся і сяляне – для разсылкі лістоў, рамонту цэркваў. Пазней свяшчэннікі самі наймалі людзей "для царкоўнай службы", а падданыя займаліся апрацоўкай зямлі. Так з 11 хат Дзмітравіцкага свяшчэнніка, 4 хаты працавала 4 дня, а 7 хат – 2 дня.

Апрача зямельных надзелаў для ўтрымання духавенства патрабавалася роковшчызна (грашовая або хлебная даніна). Роковшчызна ў пэўных месцах замяняла дзесяціну і зямлю. Зрэшты свяшчэннікі, карыстаючыся рокоўшчызнай мелі таксама зямлю.

Да ліку прывілеяў у той час можна залічыць права варыць піва, гнаць водку і прадаваць яе без падатку. Продаж піва і водкі была даходам не толькі брацтва,



Царква св. Ануфрыя Вялікага ў Баршчэве; фото Д. Фіоніка

але і свяшчэнніка. Рынкавае і мядовае мыта, лоўля рыбы, збіранне ягадаў, арэхаў, грыбоў, паляванне з ружжом – вось гэтыя прывілеі, якія можна знайсці ў фундацыйных і эрэкцыйных актах.

Род Сапегаў, уласнікаў горада Высокае Літоўскае, апрача царквы ў Баршчэве быў фундатарам ажно 54 вуніяцкіх цэркваў. Толькі Леў Сапега фундаваў іх сем.

Паводле дакументальных звестак, у 1718 г. кцітарам (фундатарам) баршчэўскай царквы быў памешчык Станіслаў Хжаноўскі. У 1796 г. Баршчэва было ўладаннем Матушэвічаў. Баршчэўская царква з прыхадской стала філіяльнай св. Успенскай царквы ў Цэркоўніках. У гэты час настаяцелем у Баршчэве быў а. Іаан Маркевіч. Прыхажан было 772 чалавек.

У XIX ст. Баршчэва было ўласнасцю графаў Грабоўскіх. У 1840 г., са сродкаў Пелагіі Грабоўскай, была пабудаваная царква з палявых камянёў, першая такая ў камянецкім благачынні. Удзячныя прыхажане, у 1874 г., у памяць фундаткаркі, пабудавалі на могілках драўляную царкву ў гонар св. Пелагіі. Яе рамантавалі ў 1865, 1868, 1882, 1894 і 1903 гадах. У 1900 г. была пабудаваная надбрамная, каменная званіца. У 1906 г., з прыватных сродкаў настаяцеля а. Іаана Шырынскага пабудавалі прыхадскі дом. Свяшчэннік вельмі спрыяў развіццю школьніцтва. Напачатку XX ст. у Баршчэве дзейнічалі дзве школы – мужчынская з 104 вучнямі і жаночая, з 41 вучаніцамі. Сродкі на ўтрыманне кліру паходзілі з даходаў ад зямлі – звыш 57 дзесяцін.

У 1908 г. настаяцелем прыхода ў Баршчэве стаў а. Максім Санкевіч, родам з Клішчэль (пра яго мы пісалі ў 46 нр Б.Г. – рэд.). Псаломшчыкам быў Ігнат Дарашэўскі. Прыход належыў да сярэдніх па ліку вернікаў. У 271 дамах жыло 2191 прыхажан, з чаго: у Баршчэве 601 чалавек (73 дамы), Мураўчыцах – 234 (30), Забалоцці – 179 (21), Мінкавічах – 636 (83), Хацінаве – 538 (71).

Баршчэўская царква ў міжваенны перыяд

У 1924 г. царкве належыла 38 дзесяцін зямлі сярэдняй якасці; абрабляласся клірам. Кружачнага збору было 150 злотых. Прыход налічваў 1045 прыхажан, пражываючых у 195 дамах. У Баршчэве было 291 праваслаўных (67 дамы), Мінкаўцах – 279 (42), Хацінаве – 299 (64), Мураўчыцах – 1ї8 (22) і Чэрнево-Забалоцці – 58 асобаў, пражываючых ў 8 дамах.

Царква была бедная ўбранствам. Не мела багаслужбовых кнігаў, бібліятэкі, летапісі. Свяшчэннікам быў а. Канстанцін Сабатовіч, народжаны ў 1860 г., сын свяшчэнніка з Новых Кішнеўцаў Крэменецкага павета. Закончыў ён у 1880 г. Валынскую духоўную семінарыю, у наступным годзе быў рукапаложаны ў свяшчэнніка да Жарабкоўскай царквы Старааканстанцінаўскага павета Валынскай губерні. Служыў у цэрквах у Булдычаве, Рожніцы, Шымбары. З 1914 г. быў судавым следчым, членам епархіяльнага з'езду, благачынным 1-ай акругі старааканстанцінаўскага павета.

Псаломшчыкам у Баршэчве на той час быў Сімяон Вікенцієвіч Хруцкі, народжаны ў 1866 г. у сяле Жытлін Косаўскага павета на Палессі. Вучыўся ў Жыровіцкім духоўным вучылішчы, якое пакінуў пасля трэцяга класа і падаўся ў паслушнікі ў Супраскі манастыр. У 1915-1919 г. прабываў на бежанстве, дзе ў Маскве быў псаломшчыкам пры царкве на Нова-Садовай. У 1924 г. апынуўся ў Баршчэве.

Старастай царквы быў Георгій Фаддзеевіч Гарбач.

1925

Царкоўнай зямлі было 57 дзесяцін. Даход з зямлі складаў 200 злотых. Былі ўжо багаслужэбныя кнігі, але царкоўнага абсталявання недастаткова. У прыходзе не было школы. Айцец Канстанцін Сабатовіч з Баршчэва выехаў, прыходам часова ўпраўляў а. Мікалай Будзіловіч з Высокага. Псаломшчыкам быў Шырынскі з Высокага. Старастай – жыхар в. Мураўчыцы Мікалай Стэпанюк.

Прыход налічваў 1083 прыхажан, пражываючых у 202 дамах.

1927

У Мінкавічах была адчынена школа. Свяшчэннікам быў а. Сергій Леўчук, псаломшчыкам Кірыл Уладзіміравіч Мацкевіч. Нарадзіўся ён ў 1898 г. у Мінску; у 1915 г. закончыў Слуцкае духоўнае вучылішча.

Кружачны збор царквы складаў 450 зл., даход з зямлі – 300 злотых. Прыход налічваў 1343 прыхажан, пражываючых у 277 дамах.

1928

Свяшчэннік ад Брэсцкага павятовага староства атрымліваў 480 зл. гадавой датацыі. Псаломшчыкам быў Уладзімір Міхайлавіч Малышыцкі, народжаны ў 1906 г. у Парахонску пінскага павета. У 1925 г. здаў экзамены на псаломшчыка пры Палескай Кансісторыі. У 1928 г. назначаны псаломшчыкам у Баршчэве.

У гэтым годзе на тэрыторыі прыхода было сабрана 3940 зл. на рамонт царквы. Прыход налічваў 1387 прыхажан.

1929

У гэтым годзе старасту Мікалая Стэпанюка замяніў Раман Канстанцінавіч Рубашэўскі. Кружачны збор складаў суму 1100 зл. а даход з зямлі – 900 зл. У філіяльнай царкве нічога, апрача сцен і даху, не было. Прыход налічваў 1387 прыхажан.

1930

У гэтым годзе прайшоў рамонт царквы. Дах быў пакрыты цынкавой бляхай і памаляваны, а крыжы пазалочаны. Свяшчэннікам быў а. Георгій Раенскі, народжаны ў 1887 г. у сям'і псаломшчыка сяла Дзерэўная Кобрынскага павета. У 1904 г. закончыў царкоўна-настаўніцкую школу ў Трасцянцы. З 1913 г. служыў дыяканам пры царкве ў Нараўцы. У час бежанства быў дыяканам кафедральнага сабора ў Калузе; тут жа здаў экзамен на свяшчэнніка. Пасля паваротаў з бежанства, у 1919 г. стаў свяшчэннікам царквы ў Кругелі каля Камянца. Служыў пасля іўіншыхнавакольныхцэрквах–Трасцяніцы (1920), Блудні (1925), Байках (1928). У 1930 г. быў назначаны да Баршчэва.

Псаломшчыкам у гэтым годзе быў надалей Кірыл Мацкевіч, а старастай Раман Рубашэўскі. Прыход налічваў 1453 прыхажан, пражываючых у 280 дамах. У Баршчэве пражывала 442 праваслаўных асобаў (78 дамы), Мінкаўцах – 392 (77), Хацінаве – 366 (74), Мураўчыцах – 164 (34) і Чэрнево-Забалоцці – 89 асобаў, пражываючых ў 17 дамах.

У 1931 г. ў Баршчэве была адчынена школа.

Пасля II сусветнай вайны

У 1941 г. свяшчэннікам царквы ў Баршчэве быў назначаны а. Іпацій Манько.

Зараз пасля вызвалення Баршчэўская царква была ў 1945 г. зарэгістравана Саветам па справам рэлігіі пры Брэсцкім аблвыканкаме. Свяшчэннікам быў тады а. Трафім Юрчук, якога 29 мая 1947 г. назначылі настаяцелем Мікалаеўскай

царквы ў надбужанскіх Крынках.

Прыхадская царква св. Ануфрыя, за ўвесь часу барацьбы з рэлігіяй, не закрывалася. Іншы лёс спаткаў могільнікавую царкву. На аснове пратаколу нр 8 Брэсцкага аблвыканкома з 1 чэрвеня 1961 г. Баршчэўскую філіяльную могільнікавую царкву св. Пелагеі скрэслілі з рэгістрацыі. Гэта на практыцы абазначала дазвол на яе зруйнаванне. Але веруючыя людзі яе абаранілі і ў 1997 г. яна ізноў была адкрытая.

Сказ пра Хацінава

Калі ў 1812 г. французы ўцякалі з Масквы, адзін паранены ў нагу француз патрапіў у сяло Хацінава. Тутэйшы селянін даў яму прытулак – дах над галавою і яду. Француз адпачываў і мазаў пашкоджаную косць нейкай масцю. Косць хутка загаілася і салдат пайшоў у сваю Францыю. Адыходзячы, падзякаваў за дабро гаспадару і падараваў рэцэпту на гэтую масць. Масць атрымала назву “хацінаўскай”. Некалькі пакаленняў зналі сакрэт масці. Затым сакрэт дайшоў у Чэрнаўчыцы, Высокае і іншыя мясціны. Аўтару гэтага матэрыялу сакрэт масці быў выяўлены жыхаркай Высокага спадарыняй Гіндзюк за маю дапамогу ў атрыманні ёю пенсіі.

Георгій Мусевіч

Напісана 1-2. 01. 2007 г. у Камянцы. Заснаваным князем Валынскім Уладзімірам-Іаанам Васількавічам. Благаверным і Благачэсцівым. Лета Божага 1276

Крыніцы:

1. Гродненский Губернский-Указатель населенным пунктам. Гродна 1905, Статистический Комитет Гродненской губерніи
2. Marian Radwan, Kościół greckokatolicki w zaborze rosyjskim około 1803.
3. Marian Radwan, Carat wobec Kościoła greckokatolickiego w zaborze rosyjskim w 1796-1839 r.
4. Николай Малишевский, Из быта белаго уніатскаго духовенства, Вильна, Литовские Епархіальные Ведомости 1873.
5. Дзяржаўны Архіў Брэсцкай Вобласці, ф. 2059, оп. 4, 10-16.
6. Нацыянальны Гістарычны Архіў Беларысі ў г. Гродна, ф. 561, оп. 15, 15.



З Камянца дайшла да нас прыемная вестка. Беларуская Праваслаўная Царква ўзнагародзіла Георгія Сцяпанавіча Мусевіча медалем св. Кірыла Тураўскага. Шчыра віншуем!

Прыемна нам таксама паведаміць чытачоў, што 21 мая г.г., ў час нашай рэдакцыйнай візіты ў Камянцы, спадар Георгій Мусевіч перадаў нам у карыстанне шмат аўтарскіх матэрыялаў па гісторыі праваслаўных прыходаў на Камянеччыне. Матэрыялы будзем паслядоўна друкаваць у чарговых нумарах.

КОБРЫНШЧЫНА

Летопісец вёскі Леліково

В 46 нумэрові Б. Г. познаёмілі мы чытачуов з поэмою Пэтра Шэпэтюка "Е про сэбэ". Автор, на штодэнь жытэль вёскі Леліково на Кобрыншчыні, напісав еі на тороканскуй мові – рэліктовуй групі говуорок з Полесся. Пэтра Шэпэтюка, разом з жуонкою Анастасіёю госцілі мы в сіетым рокові тры разы на фестывалю „Там по маёвуй росі". Пан Пэтро обходів з намі жыто на Юрыя, ходів з кустом на Труойцю і дожынав жыто на Старых Порубах. А пуод кунэць ліета до Лелікава завітала наша Жэмэрва. Пэрэшла корогодом чэрэз сэло, радуючы песнямі і танцямі ёго жытэлюв.

Пэтро Шэпэтюк, опроча творэння поэзії, е таксамо автором опрацованя про гісторыю і культуру свого руодного сэла, якого можна порувняті до „Золотуй кнігі про вёску Кнорозы". В ім знайдэм наступны роздіелы:

- Старонкі мінулага
- Пасляваенны перыяд. Утварэнне калгаса
- Пасляваенныя гады
- Лад жыцця
- Слоўнік мовы вёскі Лелікава
- Абрад вяселля ў вёсцы Лелікава
- Прозвішча жыхароў вёскі Лелікава
- Тапаніміка
- Прыказкі і прымаўкі, байкі і пагалоскі, якія пачуў я ад старых сялян вёскі Лелікава



Пэтро Шэпэтюк з жуонкою Анастасіёю в Студзіводах на фестывалёві "Там по маёвуй росі", 5 мая 2012 р. Злевуй сідіт Анатоль Кравчук з Крывуй, 15 червіен'а с'ого року узнагороджоны ордэром „За віерност' Бат'кувшчыні".

Мова Лелікова нэзвычайна. На юй говорат туолькі в парох полескіх сёлах, і то пороскіданых од сэбэ. Мнуого спульного тороканьска говуорка мае з сэрбскою мовою. Про тые говуоркі пісав в 46 нумэрові Фёдор Клімчук. Тут знаёмім чытачуов со словніком выбраных слуов мовы Лелікова, якіе в 2000 рокові запісав Пэтро Шэпэтюк. В наступнум нумэрові надрукуем матэрыял про вэсіельну обрадность в Лелікові.

(рэд.)

Слоўнік мовы вёскі Лелікова

А

Абэ якэй – абы які, так сабе, дробны, нікчэмны
Аджа, атьжа – а вось жа (Аджа він гэнда йда, а казалэ шчо він ны прэда)
Арцэ – хоць які-небудзь (Шчоб в хозяйствэ був арцэ якэй мужэк)
Арыштант – непаслухмяны, свавольны хлапчаня
Аркуш – кавалачак просвіры пасля прычашчэння

Б

Бабурыть – кідае, б’е (Вбабур його да чэм кручаным, шчоб він втыхомэрывся)
Бабнык – валацуга за бабамі
Бадэлля – бульбяное ці другое агароднае сцябло
Бандюга – вялікая выбоіна на дарозе з граззю і вадой
Барлыг – утульнае кубло з саломы ці другой падсцілкі (Свэнэ вжа барлыг нэхорать, буда нагода)
Барэло – драўляны посуд для вадкасці
Бало – бывала (Бало буяло, а тапар ны сходыть)
Балёк – драўляны брус для столі
Балабуха – конскае гаўно
Балакатэ – размаўляць
Бар’ек – нятоўстае дрэва ачышчанае ад сучкоў
Балія – драўлянае круглае карыта з клёпак або з цэльнага куска ствала дрэва для паласкання адзежы
Бараболя – ежа
Блюмка – бурбарачка на вадзе (Пропадаш ек блюмка на воді)
Бодек – асот
Бовдсур – высокі, няуклюжысты чалавек
Брацїх – дваюрадны брат
Братовая – братава жонка
Бровар – самагонны апарат
Брід – брод
Бардо – бёрда, частка ткацкага станка
Барог – бераг
Барагчэсь – берагчыся
Багно – 1. Багун, 2. Непраходнае гіблае месца, дрыгва
Брахатэ – гаўкаць, брахаць
Бражнэк – ёмкасць, драўляная бочка для заварывання брагі на самагон, мае два дна
Браданькнутэ – упасці
Брохатысь – хадзіць па вадзе, плёскацца
Бусань – бусел
Буен – бык-вытворнік
Біб – фасоля
Брук – маставая з каменя
Бруква – рэпа

В

Варакузытэ – цягамоціць (Ну чаго він там варакузыть, спузнэцця на автобус)
Варабітысь – затрымлівацца, калупацца
Вдолатэ – адолець, выканаць (Ну мы такэ вдолалэ скосэтэ ціту “козу” (участак)
Валыён – вялікі, высокі ростам мужчына
Ввочох – хутка, у момант
Вдосвіса – на досвітку
Вішалнык – вісельнік
Волочанна – гасцінец на Вялікдзень (Ходімо на Паску до тіткэ по волочанному)
Волочэтэ – баранаваць поле
Внагін – наўздагон

Воло – валлё ў птушка
В'юн, оюн – рыба уюн (Наловэв оюныв ў калу (кал – гразюка)
Воротэло – навой у кроснах
В'езка – вязанка сена
Вэкарок – нестрыманы, бурхлівы чалавек
Вэгалушів – выбіў, знішчыў
Вэлыцэ – рот, горла (Ну чого тэ вэлыцэ свої роззевів?)
Варашчэтэ – крычаць, верашчаць
Вэсякавсь – высмаркаўся
Вачуркэ – вячоркі (Ходімо до сусіда на вачуркэ)
Вэскірыв, вэшчірів зубыэ – выскаліць зубы
Вштурав – прызвычаіўся, звык
Вструнцатысь – умешвацца ў чужую справу
Варанык – варэнік з сырам
Варос – верас
Вальмэ – вельмі
Вішэй – сухая трава
Вэкрутань – вялікі, здаровы полод пасля нараджэння
Вэтрішчів – вылупіў вочы, зубы, жывот
Вэсмагнув – загусцеў борш (Вэсмагла каша)

Г

Гагавіця – горла
Гарджола – глотка, горла
Гадка – думка (А е і гадкэ ны маў, што тэ прэдаш)
Гале – чысты прастор без дрэў, кустоў, будынкаў
Газывка – 1. лямпа, 2. хустка з штучнай тканіны
Галёвка – скручаная маладая бярозка ці лаза
Гаман – дробнага злодзея на кірмашы білі гуртом (Товчуть, бьют ек гамана)
Глушман – глухі чалавек
Гойсатэ – бегаць без толку
Гоношэтэ – назапашваць без меры, многа
Годоватэ – вырошчваць
Гойдочка – гушкалка
Глогэ – баярышнік, глог
Годэ – хопіць, перастань

Д

Давновічно – вельмі даўно (Ста людэна давновічна)
Длупатыся – калупацца
Довсаль – чалавек вельмі вялікага росту
Допадатэ – імкнуцца
Дораштытэ – знішчаць да канца
Дотынатэ – папракаць
Даржек – ручка, чаранок
Дарно – дзірван (Тут тежко оратэ, самоя дарно)
Дась там – дзесці там
Духвай – адчувай, кіруйся сваім пачуццём
Дэль – брус, абрэзаны з чатырох бакоў
Дараво – дрэва, лес на будоўлю дома
Дыхтітэ – цяжка дыхаць

Ж

Жардэна – жардзіна
Жахнутэ- бліснуць, загрымець (пра гром, маланку)
Жеба – жаба
Жевратэ – жаваць, есці сухое
Жнаць, жетэ жэто – жнец, жаць жыта
Жовна – птушка жаўна
Журахлэнэ – журавіны

З

Заборсатэ – зашнураваць чаравікі
Забавлетысь – бавіцца, іграцца (Забавлеяцця ек дытэна малая)
Забраковало – не хапіла
Заварэтэ – перашкаджаць, блытацца пад нагамі
Завара – дзіцё, якое перашкаджае рабоце
Завэтэ хустку – завіць, завязаць на галаву хустку
Заграбстэ – згрэбсці, сабраць сена
Заколотёна яйца – апладненае яйца
Загрузнутэ – праваліцца, засесці ў балоце

Загусло – загусцела (Каша ў пачі загусла)
Задріпаны – не харошы, стары, нягодны
Заздроны – зайздрасны
Закачетэ калошвэ – закасаць штаніны
Закіс – пракос скошанай травы (Пруйшло по два закосэ тай затомэлысь)
Закладчіна – пачастунак майстроў у пачатку будоўлі хаты
Запорішцэ – незапрошаныя госці на вяселлі
Запоінэ – заручыны
Запінэтэ – астанавіць, не пусціць
Зара – цяпер, зараз
Зарівака – баявіты чалавек, які зарывае бойку
Заріватыся – задзірацца
Заскорузлы – пакрыты тонкім нарастам (Мое рана гоїться, ужа заскорузла)
Засмака – прыправа з тлушчу
Засмачэтэ – заправіць прысмаку ў страву
Засторкнутэ – затрымацца (Ек дам – той бы засторкнаш тут)
Засторонок – вялікая частка клуні (Валэть на поўна горло, ек у засторонок)
Застытэ – зацямняць (Ны застуй, бы ны вэдно)
Затулка – фартух
Затэлок – клінок для замацавання касы да касся
Затарусэтэ – запарушыць (вока)
Заушныця – завушніца на вуха
Зачіпка – прычына
Заялозытэ – зашмальцаваць
Залізнык – рыдлёўка
Заланэцэ – зялёнкі
Завждэ – заўсёды
Заціпіло – аднялось, прапала, паралізавала (А е так замучівсь, шчо і йістэ заціпіло)
Згарок – падсмаленая зверху бульба
Збігчэ – з'явіцца (пра бурбалку на вадзе)
Збіж – збожжа
Збурітысь – успеніцца, выліцца (пра малако на агні)
Зважытысь (намерыцца, вырашыць)
Звозанутэ – моцна ўдарыць
Згонынэ – адходы пры малацьбе
Зграя – вялікая колькасць (варон, сабак)
Здолатэ – адолець
Здмухэ – балотная дрыгва
Злыг – аблога, залеж
Змутэтэ – падмануць
Зобачітэ – убачыць
Зумэсла – наўмысна
Зяхотэть – ярла ззяе
Зэчітэ – жадаць (Зэчу тобі, шчоб всё добра було)

Й

Йіж – вожык
Йда – ідзе
Йдэ – ідзі
Йістэ – есці

К

Каблук – аснова, круг з лазы для пляцення каша, карзіны
Кавдун – страўнік свінні
Каврух – страўнік свінні ў які напіхваюцца запраўленыя рознымі прыправамі, прысмакамі, костачкі
Кал – гразь, бруд
Кайдуб – посуд, вудзеўбаны з калоды
Капалюш – капялюш
Карбэ – рубцы на падэшве чаравіка
Кашанка – крывяная каўбаса
Квітка – заканчэнне якой – небудзь вялікай работы
Квічэть – вішчыць (аб свінях)
Клёкотатэ – клекатаць
Клуня – гумно, хлеў
Ключка – кульбака
Кнур – кныр (Свэнка гуда, траба до кнурэ вастэ)
Кнэга – кнігаўка
Копэця – капа сена
Косар – касец
Коцюба – качарга
Копаць – месца, дзе капалі гліну, руду

балотную
Краміння – крамяні
Красноголоваць – падасінавік
Круча – моцная завіруха
Крыга – кусок лёду
Крышэтэ – крышыць, рэзаць на маленькія долькі
Кулык – сноп простай саломы для пакрыцця даху
Курава – 1. загон для жывёлы, 2. маленькая хата, 3. купка
Кэй – кій
Камора – кладоўка
Куфайка – фуфайка

Л

Лавка – 1. лаўка для сядзення, 2. крама, магазін
Лагвіця – драўляная скрыня для заслонкі сала
Ладытэ – рамантаваць
Ладытысь – жыць згодна, дружна
Лапсардак – старая адзежына
Ласыцэ – марозны ўзор на вокнах
Латуха – верхнаяя адзежына, світка
Лёкотітэ – трэсціся, дружаць
Лыхэй – 1. дзіравы, 2. злосны, нядобры (Шчоб таба лыхая годэна нагабала, надэслала!)
Лашатэ – ластрыраваць
Любэва мнэсо – мяса бэз тлушчу
Люхта – юшка (у печы)
Лякатэ – пужаць
Лятого – усё-такі

М

Мазатэ – песціць, пра дзіця (Розмазаў тэ свого хлопця, парабандюя, йістэ ны хоча)
Макуха – шалупіны ад тоўчанага льнянога семя і канапель
Манэть – прыемна пахне
Мантачка – мянташка, дошчачка для праўкі касы
Марцёватэ – пра стан цечкі ў кошкі
Махляр – хлус, ашуканец (З йім ны грай в картэ, бо він махлюя)
Мжэть – дробны дождж ідзе
Моркотань – баран-вытворнік (“Шчо чутэ?” Адказ: “Йіда моркотань на шутэ”; шута – авечка)
Мурмэло – маўклівы чалавек
Мругнутэ – буркнуць, сказаць нешта невыразнае
Мраць – нябожчык



Марыя Чыж з Лелікова (роджона в 1884 р.) коло свого дому; фотографовав Пэтро Шэпэтюк в 1979 г.

Мурлата – бервяно, якое кладзецца паверх бэлек
Мусово – абавязкова
Мцсыть – мабыць
Мутне – хлусня
Мутюн – ілгун
Мэдлытэ – азірацца, круціцца з мэтай украсці
Міхір – мачавы пузыр

Н

Навідноцэ – на відным месцы
Нагла – няшчасце (А він даўно шукаў собі наглу)
Нагледатэ –назіраць
Нагнатэ – 1. дагнаць у дарозе, 2. гнаць самагонку
Намісклыві – насычаны вільгаццю
Напрошкэ – напрасткі
Настропалэтэ – падбухторыць, настроіць супраць
Натурлыві – наравісты (пра каня)
Нашчо – навошта
Нашіховатэ – падрыхтаваць, сабраць
Нывжаж – а як жа
Нызатэ – штурхаць (Нанызаў штылгуў у бокэ)
Напоўчіў – напіхаць, наесціся (Напоўчіў собі каўдуна)
Ныхлюя – неахайная жанчына
Нычогій – нядрэнны
Ныборака – няшчасны, няўдалы
Нэшпорыть – шукае штосці

О

Обдартузнык – абарванец
Обзаль – абалонь
Обур – даць без грошай, на павер (Дай мні поросетко на обур, з пенсії оддам)
Обубратэ – аграбіць, абрабаваць
Обіратэ – рабаваць
Овад – авадзень
Одвідатэ – адведаць, наведаць
Одынэця – адзіная дачка ў сям'і
Онда – вось тут
Опівзына – звязаныя між сабой за вяршкі дзве бярозкі ці лазы, якія кладуцца на стог
Оплічок – пляча
Ополоных – чарпак
Осмалок – падсмаленая зверху бульба
Обіцянкэ – цяцянкэ, а дурнавэ – радосць.

П

Пазур – кіпцюры
Палахтітэ – палаць, гарэць моцна
Паросток – расток
Пасовэсько – паша, выган ля вёскі
Пасынок – няродны сын
Пасырбіця – сястра толькі па бацьку, няродная дачка
Пацёрэ – пацеркі
Під, подок – месца, дзе стаіць стог
Плавушка – раска
Плат – кусок палатна (тыпу наміткі)
Плешка – бутэлек
Пляжыть – ідзе безупынна (дождж)
Повал – столь
Повх – крот
Подалок – першае бервяно ў зрубе
Полова – мякіна
Половэй – светла-жоўты
Полокатэ – паласкаць
Полотте – прапалка
Поночэ – цёмна
Поскрітуха – апошняе цеста з дзяжы
Постолэ – лапці
Походдюшча – пра карову, якая ідзе ў шкоду; пра жанчыну, якая ходзіць без толку
Право – улада
Прачнік – галавасцік
Пріборкатэ – прыручыць
Прызба – завалінка
Прус – пруса
Плуска – клоп
Пудпалок – блін
Полуйнэчка – жонка мужавага брата
Прыскрэнёк – бакавая скрынка ў куфры

Приступа – прымак
Приступэтыся – прыступіцца, падысці
Прыхаманутыся – прыбрацца, апранацца ў чыстае, прыгожае
Прыхватком – урыўкам
Пудвалок – падруба; бервяно, да якога прыбіваюцца дошкі падлогі
Пулятысь – рабіць нешта марудна, памалу
Пучітысь – распускацца, набрыняць (пра пупышкі)
Параковбасывся – перахіліўся напалавіну цела
Парапасаный – перавязаны (Парапасалэ ручныком)
Парапілка – матылёк
Парапій – падарунак маладым на вяселлі
Парапіватэ – адорваць маладых на вяселлі
Пірэй – пырнік, трава
Пачурэця – шампіньён
Панькнув – лопнуў
Паль – стаўбэць, на якім клалі падошвы
Прэсок – пясок пад вогнішчам у якім пяклі бульбу.

Р

Радюшка – посцілка
Раптом – усяго (Раптом хурка сіна там буда)
Ратай – араты
Раховатэ – лічыць
Різіка – рызыка
Рабочі – працавіты
Роділля – парадзіха
Розборонэтэ – уціхамірваць тых, хто б'ецца
Роскалля – халепа (Така роскалля, шчо ны пройіхатэ)
Роспурка – разрэз у нагавіцах
Розпранутысь – зняць адзежу
Росхжтатэ – расхістаць, раскалыхваць
Рошча – рост (як працэс, урадлівасць (Ныма рошчэ траві)
Рашатях – грыб-рашэтнік
Рэжаць – пясок жоўты, зярністы
Раранутэ – неасцярожна выгрузіць што-небудзь, кінуць
Рабрэна – драбіна
Рыштак – станок для сталярнай работы
Рыштовання – рыштаванне

С

Садовэтэ – садзіць, усаджваць
Садовэтысь – садзіцца
Свінэнаць – драўляны хлеўчык для свінні
Сваріпка – свірэпа, пустазелле
Сваршчік – цвіркун (Скача сваршчік по стыні, пахна шпэрка – дайта мні)
Свэдёр – світэр
Сінных – мех напоўнены сенам, матрац бедных
Скрэня – куфар
Сколотэтэ – вытаптаць пасевы скацінай
Споконвіку – спрадвеку
Скрутэтысь – ашалець (Ціты собака скрычаны, скрутэвсь)
Скубосінка – крук для выскубвання сена з стога
Скулэтэ – скавытаць
Слота – мокры снег (Прычапэвсь, ек слота сніговая)
Слыпак – сляпень
Совплі – ледзяшы
Сокорітэ – сакатаць (пра курэй) (Кура сокорэть, мусыть настэсь хочуть)
Сокорэна – топаль
Солодойіжоватый – пераборлівы ў ядзе
Спахтітэ – хутка згарэць
Сплав – дрыгва, багністае балота
Споврочітэ – сурочыць
Спуст – фуганак
Спуднэця – спадніца
Стажор – намошчанае галлём месца для стажка сена
Стовпак – кветаноснае сцябло цыбулі
Стоконэтысь – бясконца прыбірацца
Сторчма – старчма
Срамэтэ – сароміць
Страхопуд – баязлівец

Стыдоття – вялікі сорам
Стэшчітэ – адважыцца, рашыцца
Сыломіць – цераз сілу, гвалтоўна (Сыломіццю забралэ мадярэ талушку і забэлэ)
Сувалок – скрутак саматканага палатна
Судосэв – сустрэў
Сухопарок – худы, сухі чалавек
Сало – вёска
Сякатэ – смаркаць
Салёх – качар (самец качкі)
Састренка – дваюрадная сястра
Стріпкэ – махры вакол рукавоў адзежы
Струпаць – снапы зжатага жыта, пшаніцы (5-6 снапоў пастаўленыя калоссем уверх і накрытыя зверку растапыраным снапом, калоссем унія)

Т

Талахатэ – 1. гойдацца ў розныя бакі; 2. хадзіць без справы з канца ў канец сяла
Тамрава – цемра
Темітэ – памятаць (А е вжа тоя і ны темлю)
Тапар – сёння
Топіро – цяпер
Тлумак – клунак
Томкачі – звараная тоўчаная бульба
Товнутэ – штурхнуць
Топэтэ – паліць у печы (Затопім у грубцэ, бо в ночі холодно буда спатэ)
Торкнутэ – зрушыць з месца
Трумкатэ – брынкаць
Трохкантові – трохвугольны
Труйітэ – 1. труціць; 2. смярдзець (У ёго з горла труйіть после вчорашнойі пьянкэ)
Трускавкэ – клубніцы
Трапак – прылада на якой трэплюць лён
Тарныця – станок на якім труць лён на валакно
Трапатэ язэком – гаварыць бязглуздзіцу
Тхна – дурна пахне
Талыпатысь – ледзь-ледзь ісці
Тарабэтэ біб – лушчыньць фасолю
Тхір – тхор (От набздіў ек тхір)

У

Убіратысь – 1. апранацца; 2. прыбірацца
Упасся – растлусцеў
Усёлка – вяроўка, на якой вісіць калыска
Уталовав – заганіў, замарыў
Утарабанывся – улез, залез так, што й не вылезці
Ухватка – нораў
Ухналь – цвік, якім прыбівалі каню падкову
Утыхомэрів – 1. Зрабіў ціхім, лагодным; 2. забіў
Уздачка – вуздэчка, аброць

Ф

Файны – харошы, найлепшы, прыгожы

Х

Хаятэ – абгаворваць, знеслаўляць
Хамула – нікчэмны чалавек, ні рыба ні мяса
Хоркая кровью – кашляе, харкае крывёй
Хворостэна – гнуткі дубец
Хвойіна – сасновы лес
Хвійка – хвоя, сасна
Хвілэна – мінутка, хвілінка (Вэйшоў з дому на хвілэну)
Хлопчэсько – вялікі, здаровы хлопец
Хлыпатэ – плакаць са ўсхліпамі
Хляпанэна – слата, халепа, мокры снег
Хілэтысь – скланяцца, хіліцца
Хэжі – жвавы, маторны
Хітатэ – гайдаць, калыхаць

Ц

Царэця – царэўна, царыца
Цацка – забаўка
Цымалкі – завялікі, велікаваты
Ціп – цэп малаціць збожжа
Цыпкэ – вузкія папярэчкі, ступені ў драбінах
Цяпатэ – няўмела даіць карову
Цы – ці
Цвінтар – плошча вакол царквы
Ціха – вялікі мех набіты саломай або

сенам, на якім клаліся спаць малыя дзеці ў вялікай сям'і: пяць-сем душ
Цабрік – драўляная пасудзіна з клепак; у ёй залілі адзежу, трымалі ежу свіням

Ч

Чавэтэ – душыць, расціскаць
Чарынь – под, нутро печы
Чатоватэ – пільна сачыць
Чварытэ – рабіць непрыстойнае, вытвараць
Чвэндытэ – курыць, дымець
Чоботы – боты
Чоловічок – зрэнка (зрачок)
Чоп – корак у скрыні драўлянага калодзежа
Чухратэ – скрэбсці
Чарота – асака са сцяблом круглай формы
Чаравэкэ – чаравікі
Чараво – пуза
Чаравій – пузаты
Чічік – прываротнае зелле

Ш

Швіргатэ – шпурляць
Шварготатэ – балбатаць (гаварыць на замежнай мове)
Швэдкі – хуткі, быстры, шпаркі
Шкалік – кілішак
Шкаралюпа – шкарлупіна яйца
Шлютоватэ – чысціць (кішкі на каўбасу)
Шпарэ – адубенне ад холаду (Шпарэ ў пальцэ зайшлэ)
Шпарытэ – хутка ісці
Шпэця – спіца ў коле
Штахетэ – агароджа з дошчачак
Штурбанутэ – штурхнуць
Шум – пена з малака
Шчавух – шчаўе
Шчіпты – колькасць солі ўзятая трыма пальцамі
Шчэнок – пластаваны абярэмак сена
Шчося – нешта (Ходэ, шчося скажу)
Шчур – пацук
Шолёхатысь – казытаць
Шумараддя – дробнае смецце, галінкі
Шыпулкэ – igліца хвоі
Шэтык – рэмень
Шыховатэ – шанцаваць, шчасціць
Шчано – толькі што

Ю

Юшытэ – цячы струменнем
Юшка – уха, юшка
Юзык – Іосіф, Язэп

Я

Яглітэ – сабака гоніць зайца і яглiць
Ядлы – смачны для скаціны
Ядрыное – буйное, урадлівае (пра збожжа)
Ялозытэ – вымазваць, пэцкаць

В час побывкі в Студзіводах в прошлым рокові на фестывалёві “Там по маёвуй росі - Петро Шепетюк напісав два віершы, которы публікуемо.

“Там по маёвуй росі”

Нас на Свято запросыў
Дорофей Фіонік,
Шчоб у Бельску по росі,
по росі маёвуй,
Босонож мы походылу.
Шчоб роса маёва
Наші душі розбудыла.
Шчоб на ріднуй мовэ
Мэ чіталэ віршэ.
Шчоб пісні батькіў співалэ
Самэ найхорішшэ!
Шчоб зозуля нам кувала
“Многая лета”,
Шчоб на гэтым фестывалі
Песняры й поэты
Сэрця наші хвалёвалэ.
Ішчоб творчосці красою
Ўмэлысь душэ як росою.
Дякуй тобі, Дорофей,
За твої турботэ!



Пэтро Шэпэтюк (злевуй) з зэмлякамі спуд Кобрына на св. Горыэ Грабарці, 27 ліпеня 2012 р.

Хай спріяе тобі Фея
Ў духоўным полётэ.
На такэх даржэцця Сьвіт,
І добро пануя! (*з правуй)*
Дорофей! Жівэ сто літ!
Амінь. Алілуя!

Жыццёвая вясёлка

Цікавы шлях жыццёвы –
Ён напалам з вясёлкай,
Што хмару – перасову
Аздобіць ясным золкам.

Вось і ў жыцці бывае –
Навокал хмары толькі...
І раптам, бы вясёлкай,
Жыццё кругом зайрае!

Нікому не патрэбны,
Забыты быў ты ўчора.
А сёння ты як срэбра –
Прыгожы і вучоны!

Прыйшло запрашэнне
На фестывальны фэст
І за мяжой у Бельску
Гучалі нашы песні.

Менавіта, чаму ў Студзіводах?
Там святкуецца Юры Святы.
І я святкаваў між народам,
Мужык беларускі просты.

На жаль у сваёй Айчыне
Дальбог, ты не прарок...
Дык тут хоць не маўчы ты.
Хай слушным будзе крок.

Хай бацькоў нашых песні
Ў Студзіводах гучаць.
Будзе мір на Палессі –
Будзе гора маўчаць.

Пэтро Шэпэтюк

Весна в Мікулічах

Колі с'ого року на Проводы прыбылі мы до рогац'кого прыходу на мајову росу, само сады цвілі. Свјаточны л'уде в Медвежыках выставјалі столы, вітајучы волочебнікув з Дз'атловіч коло Лунінца і нашых діті з Біел'ска. Тут гісторычна Берестіејшчына, жывут Літвіны, бо до 1795 року ціелы рогац'кі прыхуод нал'ежав до Велікого Кн'ажества Літовского. Характер тутејшых вјосок напомінаје с'ола Кам'еніеччыны. А самыје Рогачые, з парома гуліц'амі і церквоју посередіні, вел'мі подуобны на велікі с'ола Поліес'а. І в характерові л'уді је тоје, што лучыт іх з Каменіеччыноју і Пол'ес'ом.

Сонц'е вже схілілос'е за рогац'ку, Пречыстіенску церкву, јак мы прышлі на „рыночны" пл'ац і почалі водіті тут корогоды. Было јак на мал'ункові Мірка Здрајковского до плыты "Огул'кі дл'а Ганул'кі". За корогодом, которы співав рогул'ку "Ліетів бус'ол через гуліц'у" стојала група старејшых л'уді і коментовала бачне. Потуом до іх подышов шче отіец Мірослав, настојатіел' прыхода.

А раніеј зашлі мы до вјоскі Мікулічы, де може не сіем, ал'е штыры гуліц то је. Вже здал'ека в брамці нас выгл'адала најстарыејша жытіел'ніца вјоскі Ніна Токајук. В вересн'ові с'ого року сповніц'е јуој 90 ліет. Народілас'е Ніна Токајук в 1923 р. в родніе Івана Бадовца. Незвычајно здуол'на до науки, рано, бо в 17 ліет вышла замуж за Јефіма Токајука. Выгодовала пјат'оро діті, дл'а јакіх офјаровала своју працу на господарці і рукодіел'у. Бо до діс' дн'а шче зајмајец'е ткацтвом.

Од самого початку в жыц'ові Ніны Токајук важне міес'е зајмала піесн'а. Бо памет' і голос міела і маје дос'ул' выдатны. Особліво л'убіла співаті в дуеті з колежанкоју з Мікуліч Јевгіен'оју Вішенко. Мікола Гајдук, јакі запісав од іх піесні, в "Белорускім Календары" за 1981 руок пісав: "Ніна Такаюк і Яўгіння Вішэнка любяць спяваць у дуэце. Аднолькавая ўражлівасць на самыя далікатныя асаблівасці напеву і натуральная суладжанасць галасоў спявачак ужо колькі год палоніць тысячы слухачоў на конкурсах "Беларуская песня", на фэстынах БГКТ, у беларускіх перадачах па Беластоцкаму радыё, на розных урачыстасцях. І ўсіх за-



Ніна Токајук в Студзіводах на фестывал'ові "Там по мајовуј росі", 2008 р; фото Ј. Дембовского

хапляе шчырасць і непасрэднасць гэтага спеву – апавядання ў лепшых песенных традыцыях нашага рэгіёна”.

Тепер Ніна Токајук співаје шче в церковным хорові, а і не одмовл’аје всіем тым, хто до јеји прыјежджаје послухаті і запісаті обрадовы і позаобрадовы пiесні. Дојехав тут і наш выдатны фол’клорыст о. Лука Бартошук з Клішчел’, і мнуого іншых.

Мніе пошчасціло до Ніны Токајук вперше трафіті 24 квієтн’а 2007 року, з сестроју Ан’оју і Іоанноју Ал’екс’ејук з рогац’куј л’еснічувкі. Мікуліцкуј заховал’ніцы традыцїі запропоновалі мы удіел в фестывал’ові “Там по мајовуј росі”. І пані Ніна одразу згоділас’е. Пару ліет до Студзівуод прыјезджала, вучывшы молодых л’уді рогул’кув, городув і весновых ігрув.

Што про городы, значыт короводы росказала нам тогды Ніна Тока.ук і јакіје рогул’кі заспівала. Почытајте...

Город

Выходілі на Велікден’ з церкві, з в’ечерні, і пароваліс’а. Беруц’ц’а за рукі. Хлопец’ або дівчына стоіт на переді, а тут всі парамі – хто з кім ходіт, јак бы наженченство – хлопец’ і дівчына. І таја задн’а пара біжыт – тој з теји, таја з теји. І топір јак хлопец’ старајец’ц’е жеб дівчыну злапаты – выклікаје, а јак дівчына – то хлопц’а выклікаје. А јак обіжат і вз’аліс’ за рукі, то вже трымајуц’ц’е. Часом бiегајут довго, довго...

Ігра

Мету, мету дороженьку, мету розметаю
Кого верно я люблю, того выбираю
Сцелю, сцелю платок белы, сцелю росцилаю
Кого верно я люблю, того выбіраю
Ісаіе ликуй, як ты любишь – не бракуй,
Если будеш браковать
Будешь веник цыловать.

Ігра

По бережку красна девушка идёт
Ей на встречу, Ей на встречу
Красный молодец ідёт
За пол версты, за пол версты
Ніско клан’ается
А Девица отворочивается.
Ты девица, ты девица, неспокорливая
Придёт время, придёт время
Ты попросиш меняМ
Прости милой, прости милой,
Чем обидела тебя,
Поколися, поклонися,
Поцылуемося.

Рогул’ка

Ој чыја то бырозон’ка
В пол’у рано подміт’она
Ој, л’он – лілија.
Ој, л’он, лілија.

Васыл’ова бырозон’ка
В полі рано подміт’она
Ој, л’он, лілија...

Там Васыл’ко з торгом стоіт,
З торгом стоіт, з чырвычкамы,
Ој, л’он – лілија...

Всім дывон’кам роспродаје,
А дл’а Ані даром даје.
Ој, л’он, лілија.
Ој, л’он, лілија

Рогул’ка

Ој, чыја ж то берозон’ка
В пол’у рано подміт’она
Ој, л’он лілија,
Ој, л’он лілија.

Стыпанова берозон’ка
В полі рано подміт’она
Ој л’он, лілија.

Там Стыпанко з торгом стоіт
З торгом стоіт, з чырвычкамы.
Ој, л’он, лілија.

Всім дывон’кам роспродаје,
А дл’а Г’ені даром даје.
Ој, л’он, лілија.

Рогул’кі мы шче менжаткамі довго співалі...

Рогул’ка

Ој, хто, хто ж по саду ходіт
Ој, хто, хто ж
Каліну ломіт
Каліна зел’онаја
Чырвона, обшчыкана
Ранен’ко.

Дывчына по саду ходыт
Дывчына каліну ломіт
Каліна зел’онаја...

Ој, хто јуој допомогаје
Ој, хто јуој квіеткі рувн’аје
Каліна...

Волод’а јуој допомогаје
Волод’а квіеткі рувн’аје
Каліна...

Рогул’ка

Брынылі рыкі, брынылі
До пана Петручука, до сыні.

Там всі молодці збыраліс’
На мід, на выно складаліс’.

Ој, хто ж там, хто ж там најбуол’ш дав,
Ој, хто ж там хто ж там најбуол’ш дав.
Молоды Кол’ун’а вуон најбуол’ш дав,
Он собіе Гандз’ул’у сподобав.

А посл’а співајут рогул’ку про тры міс’аці јасны:

Рогул’ка

Тры міс’аці јасных,
Тры зорон’кі красных
Ој, рано, ні-рано
Першы міс’ац’ јасны,
Тој Васыл’ко красны
Ој, рано, ні-рано
Перша зорка јасна,
Тој Ганул’а красна,
Ој, рано, ні-рано
Другі міс’ац’ јасны,
Тој. Васыл’ко красны,
Ој, рано, ні-рано.
Друга зорка јасна....



Так коліс’ воділі городы на пл’ацові перед церквоју в Рогачах, рысунок Мірослава Здрајковского

І тут даліеј называјут ім'ена дівчын'ат і хлопц'ув...

Рогул'ка

Чом же ты Нычыпуор
З ран'н'а не женывс'а.
Ој, рано, ны рано
З ран'н'а ны женывс'а.

Вже твоја дывчына
Росла, переросла
Ој, рано...

Росла, переросла,
Поставыла кросна
Ој, рано...

Кросна сосновыјі,
Ныткі воловыјі
Ој, рано...

Што бердечком стукне
Сорок ныток пукне.
Ој, рано...
Шчо ј нытон'ку звіаже
Сама спаты л'аже.
Ој, рано...

А прыјде Іванок
То ж і јејі збудыт
Ој, рано...

Уставај, уставај
Ты моіе кохан'е
Ој, рано...

Зготуј же мніе, зготуј
У пол'е сн'адан'е
Ој, рано...

Ја своіе сн'адан'е
У кішен'у ношу
Ој, рано...
За тебе Ман'ул'у
Пана Бога прошу
Ој, рано...

*А вже в суботу перед Проводамі рогул'ку топылі. Робылі балвана јакого і во оз'орко вкыдалі. Тогды співалі остатн'у рогу*л'ку, посл'а јакіеји росходіліс'е до хатув:

Рогул'ка

Кладіте кладкы вербовы, вербовы
Час вам дывон'кы додому, додому.
А ты Кол'ун'а тут зостан', тут зостан',
Прыјде Ман'ул'а бузі дај, бузі дај...

Ніна Токајук знаје, што рогул'кі је велікім богацтвом кул'туры тутеј шых Біелорусув. Воны сповн'алі рол'у наставнікув добрых односін до другого чоловіека. Учылі делікатносці, кул'турносці, скромносці. Веселілі л'уді, ал'е і высміејвалі заганы чоловіечы. А городы – корогоды і вс'акі ігры лучылі л'уді. Јак подкрес'л'ује Ніна Токајук: "Бо ж рогул'кі то вс'о је такіје, жеб лончыті – хлопц'а і діевчыну...".

Дорофіеј Фіонік
foto ***Ј. Дембовскі, К. Антоновіч***